Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 ВЕРАСНЯ 2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 169 (26034)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Парадак дня саміту кіраўнікоў дзяржаў СНД у Душанбе будзе ўключаць каля 20 пытанняў

Парадак дня маючага адбыцца саміту кіраўнікоў дзяржаў СНД будзе ўключаць каля 20 пытанняў, галоўныя з якіх — Канцэпцыя развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў і План асноўных мерапрыемстваў па яе выкананню. Аб гэтым праінфармаваў 6 верасня Прэзідэнта Беларусі першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Уладзімір Гаркун.

Сустрэча на вышэйшым узроўні, як чакаецца, адбудзецца 5 кастрычніка ў Душанбе.

Падрыхтаваны праект канцэпцыі прадугледжвае далейшае эвалюцыйнае развіццё СНД, інтэграванне дзяржаў — удзельніц у эканамічным і палітычным плане для павышэння эфектыўнасці ўзаемадзеяння.

У праекце канцэпцыі прапануецца старшынства на ратацыйнай аснове. Эксперты лічаць мэтазгодным, каб старшынства на працягу аднаго года ў Савеце кіраўнікоў дзяржаў (СКД), Савеце кіраўнікоў урадаў (СКУ), Савеце міністраў замежных спраў (СМЗС), Эканамічным савеце (ЭС) ажыццяўлялася адной дзяржавай адначасова. На думку экспертаў, гэта павышае адказнасць краіны за рашэнні, што прымаюцца, і вынік.

На дзейнасць СНД сёння негатыўна ўплывае неабавязковае выкананне краінамі рашэнняў, што прымаюцца ў Садружнасці. У сувязі з гэтым уводзіцца інстытут нацыянальных каардынатараў, якія будуць адсочваць рашэнні кіраўнікоў дзяржаў і вышэйшых органаў і несці адказнасць за іх выкананне.

Цяпер завяршаецца распрацоўка Плана асноўных мерапрыемстваў па выкананню канцэпцыі. Чакаецца, што 14 верасня ў Мінску адбудзецца апошняе пасяджэнне Міждзяржаўнай рабочай групы па гэтаму пытанню. Дакумент рыхтуецца па даручэнню прэзідэнтаў, дадзенаму на чэрвеньскім нефармальным саміце ў Санкт-Пецярбургу. 6 кастрычніка ў сталіцы Таджыкістана будуць засядаць вышэйшыя органы Еўразійскага эканамічнага супольніцтва і Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Акрамя таго, чакаецца, што ў лістападзе па ініцыятыве Туркменістана ў Ашхабадзе пройдзе пасяджэнне кіраўнікоў урадаў СНД.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КАГО ПРЫЗНАЮЦЬ ЛЕПШЫМ ЛЕСАРУБАМ?

7—8 верасня на базе Мазырскага доследнага лясгаса пройдзе адкрыты чэмпіянат Беларусі сярод вальшчыкаў лесу «Лесаруб-2007».

Удзел у спаборніцтвах прымуць лепшыя лесарубы з усіх абласных вытворчых лесагаспадарчых аб'яднанняў Беларусі, а таксама замежныя госці. Лесарубы будуць спаборнічаць у майстэрстве валкі дрэў і распілоўкі, устаноўцы новага цэпу на бензапілу, распілоўцы камбінаваным спосабам, абрэзцы галля і працы сякерай. У першы дзень спаборніцтвы пройдуць на дзялянцы Маісееўскага лясніцтва, дзе свае дасягненні ў валцы лесу прадэманструюць каля 50 вальшчыкаў. Стэндавыя спаборніцтвы пройдуць на стадыёне населенага пункта Казенкі, што за два кіламетры ад Мазыра. Будзе арганізавана праца выставы-кірмашу тавараў народнага спажывання, якія вырабляюцца лясгасамі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

АЛЕЯ ЦВЯРОЗАСЦІ

Алея цвярозасці будзе закладзена 7 кастрычніка ў вёсцы Мосар Глыбоцкага раёна. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў мясцовым каталіцкім прыходзе.

Ініцыятыва пасадзіць алею, якая сімвалізуе намаганні людзей у барацьбе з алкагалізмам, належыць настаяцелю мосарскага касцёла святой Ганны ксяндзу Юозасу Бульку. Для закладкі першых саджанцаў алеі ў Мосар з'едуцца прадстаўнікі беларускіх таварыстваў ананімных алкаголікаў, а таксама ўсе жадаючыя. Прычым, як адзначаюць арганізатары, дрэўца можна будзе пасадзіць не толькі за сябе, але і за блізкіх, якія пакутуюць ад немачы п'янства. Алея будзе пачынацца за касцёлам, ля скульптуры прарока Маісея. Па ўсёй яе даўжыні будуць размешчаны камяні з выбітымі на іх надпісамі аб шкодзе п'янства. Непадалёк ад яе адкрыецца кафэ, дзе будуць гандляваць толькі безалкагольнымі напоямі, ласункамі і садавінай.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

ДА 940-ГОДДЗЯ МІНСКА ЗАСТАЎСЯ 1 ДЗЕНЬ!

Незвычайны сюрпрыз падрыхтавалі гараджанам работнікі УП «Мінскзеленбуд» да 940-годдзя беларускай сталіцы. Каля будынка Мінскай гарадской ратушы змантаваны кветкавы гадзіннік. Электронны гадзіннікавы механізм устанавілі на бетоннай падушцы і закрылі яго спецыяльнай рашоткай. Кветкі ж упрыгожваюць цыферблат.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

16 МЛН РУБЛЁЎ — ДА ПЕНСІІ?..

Мінскі пенсіянер падазраецца ва ўчыненні крадзяжу буйной сумы грошай, якую ён «адшукаў» па месцы былой працы.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, Фрунзенскім РУУС узбуджана крымінальная справа ў адносінах да 61-гадовага пенсіянера. Паводле папярэдняй інфармацыі, «прыбаўку» да пенсіі ён «зарабіў», калі з'яўляўся дырэктарам адной з мінскіх установаў адукацыі. Як мяркуецца, у перыяд з мая 2004 па жнівень гэтага года тады яшчэ адказная асоба ўчыніла па месцы працы крадзеж 16 млн 250 тыс. рублёў, што належалі Мінскаму гарадскому ўпраўленню культуры. «Экспрапрыяцыю» сродкаў падазроны правёў шляхам прыёму на працу ў школу на пасады тэхнічнага персаналу некалькіх падстаўных асобаў і налічэння ім зарплаты і іншых матэрыяльных выплат.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРАДПРЫМАЛЬНІК «РАСКРУЦІЎ» ВЯСКОЎЦАЎ

26-гадовы бізнэсмен, які ўзяўся выканаць будаўніча-мантажныя работы па будаўніцтву двух індывідуальных дамоў, запатрабаваў ад сваіх кліентаў грошы наперад. Не апасаючыся нейкага падвоху, людзі перадалі прадпрымальніку банкаўскія чэкі на агульную суму больш за 22 млн рублёў і, зразумела, чакалі вынікаў ад сваіх укладанняў. Але надзеі іх не спраўдзіліся: прайдзісвет работ не выканаў, а вось грошы — «асвоіў». Узбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

У ДТЗ ПАД ЖЛОБІНАМ ЗГАРЭЛА МІНЧАНКА

6 верасня на трасе Гомель—Мінск у раёне Жлобіна адбылося сутыкненне адразу чатырох аўтамабіляў. У выніку аварыі ў адной з аўтамашын згарэла жыхарка Мінска 1978 года нараджэння, якая, паводле папярэдніх звестак, і з'явілася віноўніцай здарэння. На месцы аварыі працавала следчая брыгада, якая высвятляла ўсе абставіны здарэння. Іншыя аўтамабілі атрымалі невялікія пашкоджанні, іх вадзіцелі і пасажыры не пацярпелі.

Валерый СІДОРЧЫК, БЕЛТА.

ТАТАЛЬНАЕ ПАЛЯВАННЕ НА «ЛІХАЧОЎ»

З сёмага па дзевятае верасня шэраг дарог Беларусі апынецца пад асаблівым кантролем супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі.

У прыватнасці, як паведамілі ва ўпраўленні ДАІ МУС краіны, найбольш пільная ўвага вартавых дарожнага парадку будзе скіравана на наступныя магістралі: «Мінск—Калачы—Мядзел», «Заслаўе—Дзяржынск—Возера», «Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі», «Мінск—Магілёў», «Мінск—Гомель». А на тэрыторыі сталічнай вобласці нагляд за дарожным рухам будзе ажыццяўляцца яшчэ і з верталёта. Дарэчы, у мінулыя выхадныя падчас паветранага патрулявання Міншчыны было выяўлена і спынена 112 парушэнняў Правілаў дарожнага руху. У Дзяржаўтаінспекцыі падкрэслілі, што кантроль за паводзінамі вадзіцеляў будзе ажыццяўляцца з прымяненнем прылад фота- відэафіксацыі. А яшчэ ў гэтыя выхадныя сачыць за парадкам на аўтамагістралях міліцыянерам будуць дапамагаць дружыннікі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЖАБА Ў КАЛЯІНЕ

Пачаўся сезон міграцыі земнаводных. У сувязі з гэтым Дзяржаўтаінспекцыя Беларусі звяртаецца да вадзіцеляў з просьбай быць уважлівымі на дарогах, дзе праляжаюць маршруты вялікага перасялення жаб.

Як падкрэслілі ва ўпраўленні ДАІ МУС краіны, у месцах масавай міграцыі земнаводных устанаўліваюцца адпаведныя дарожныя знакі. Аднак не заўсёды кіроўцы транспартных сродкаў рэагуюць на іх, і, не зніжаючы хуткасць, імчаць далей. У выніку пад коламі аўтамабіляў нярэдка гіне вялікая колькасць жаб.

Бываюць выпадкі, калі аховамі такіх «аварый» становіцца да 90 працэнтаў пэўнай папуляцыі гэтых земнаводных, што пагражае зніжэннем цэлага віду. Каб спыніць «дарожную вайну» з жабамі, у некаторых месцах для іх узводзяцца спецыяльныя пераходы. Але такіх збудаванняў яшчэ нямнога. Урэшце, на кожным участку міграцыі земнаводных спецыяльныя пераходы не пабудуеш. Таму жыццё жаб-падарожніц зараз знаходзіцца ў руках вадзіцеляў. Зрэшты, кіроўцам трэба быць асцярожнымі і ў мэтах уласнай бяспекі. Жаба пад колам усё ж нясе пагрозу транспартнаму сродку, асабліва ў дажджлівае надвор'е. Дарожнае пакрыццё ў выніку масавага нашэсця земнаводных становіцца слізкім, а гэта прыводзіць да заносаў аўтамабіляў, а таксама да з'ездаў у кювет і перакульванняў транспартных сродкаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МІЛІЦЫЯ «ЦЯГНЕ БРЭДЗЕНЬ»

У аддзеле ўнутраных спраў адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля створаны дзве групы супрацоўнікаў, якіх у народзе празвалі «рыбакамі».

Па той прычыне, што яны «вылоўліваюць» самагоншчыкаў і прадаўцоў самаробнай алкагольнай атруты. У «брэдзень» гэтых «рыбаловаў» з пачатку года трапілі звыш 25 тон (!) фальсіфікаваных спіртных напояў, каля 600 літраў брагі і самагону, больш як 24 тоны спірту і спіртаўтрымліваючых вадкасцей, прыгатаваныя для незаконнага продажу. У сетцы «заблыталася» 250 парушальнікаў закона.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАМЁР ЛУЧАНА ПАВАРОЦЦІ

Знакаміты оперны спявак Лучана Паваротці памёр на 72-м годзе жыцця у сваім доме ў Мадэне раніцай у чацвер.

У сераду стан яго здароўя рэзка пагоршыўся — у знакамітага тэнара адмовілі ныркі і ён упаў у кому. У ліпені 2006 года ў яго знайшлі рак падстраўнікавай залозы. Была зроблена аперацыя, пасля якой урачы давалі аптымістычныя прагнозы на выздараўленне спевака. Аднак у жніўні Паваротці зноў аказаўся ў анкалагічным аддзяленні клінікі. 25 жніўня ён быў выпісаны.

ВЕРТАЛЁТЫ ЗША АБСТРАЛЯЛІ БАГДАДЦАЎ, КАЛІ ЯНЫ СПАЛІ

У выніку паветранага ўдару верталётаў арміі ЗША па прыгарадзе Багдада загінулі 14 мясцовых жыхароў.

Ракетны ўдар быў нанесены паміж 2 і 3 гадзінамі ночы. Чыноўнікі адзначылі, што ваенныя нібыта праследавалі баевікоў, але ніякіх двухбаковых баявых дзеянняў не вялося. У выніку абстрэлу разбураны два дамы, акрамя загінуўшых ад раненняў пацярпела дзесяць чалавек.

АЎСТРАЛІЙСКІ ПАЛІТЫК АБАЗВАЎ БУША ТУПІЦАМ

Лідар аўстралійскай партыі зялёных Боб Браун назваў амерыканскага прэзідэнта Джорджа Буша тупіцам.

Буш, які знаходзіўся з візітам у Аўстраліі, падзякаваў аўстралійцам за ўдзел у іракскай кампаніі і адзначыў, што гэта робіцца для іх жа бяспекі. У адказ на гэта выказванне Браун заўважыў, што калі справа даходзіць да аўстралійскіх інтарэсаў, дык Буш паказвае сябе беспрасветным тупіцам, а сітуацыя ў Іраку толькі паставіла пад пагрозу бяспеку краіны. Прэм'ер-міністр Аўстраліі Джон Говард падпісаў з прэзідэнтам ЗША пагадненне аб пастаўцы амерыканскай зброі, на што Браун сказаў, што лепш бы замест гэтага ён аб'явіў аб вывадзе аўстралійскіх войскаў з Ірака.

СТЫХІЯ НАСТУПАЕ

За 8 дзён рэкорднай спёкі, якая ўсталявалася ў Каліфорніі з канца жніўня, памерла 25 чалавек. У шэрагу пустынных раёнаў тэмпература дасягала 45 градусаў, пры гэтым ноччу яна паніжалася толькі на 2—3 градусы.

А ў Нікарагуа ахвярамі ўрагану «Фелікс» сталі як мінімум 38 чалавек, разбурана больш за 9 тыс. дамоў, эвакуіраваны дзесяткі тысяч жыхароў. Сіла ўрагана ацэньваецца ў 5 балаў, улады аб'явілі надзвычайнае становішча.

БУДЫЙСКІЯ МАНАХІ ЗАХАПІЛІ ПАЛІЦЭЙСКІХ

У М'янме будыйскія манахі ўзялі ў палон 20 супрацоўнікаў сіл бяспекі, якія прыехалі ў манастыр. Яны зачынілі іх у манастыры і спалілі чатыры іх аўтамабілі.

У сераду каля 400 манахаў наладзілі ў горадзе Пакоку антыўрадавае шэсце супраць павышэння цэн на паліва. Акцыя была разагнана папераджальнымі стрэламі ў паветра. На наступны дзень паліцэйскія прыехалі ў манастыр, каб папрасіць прабачэння, але былі зняволены. На працягу некалькіх тыдняў у шэрагу гарадоў М'янмы адбываюцца акцыі пратэсту, арыштаваны дзесяткі актывістаў.

АКУЛУ ВЫРАТАВАЛІ АД... КУПАЛЬШЧЫКАЎ

На пляжы бруклінскага раёна Коні-Айленд у Нью-Ёрку выратавальніку давялося ратаваць ад людзей акулу.

Марысу Міранэску расказаў тэлекампаніі, што напалоханыя з'яўленнем драпежніка ў вадзе паблізу пляжа людзі «білі акулу». «Ад 75 да 100 чалавек акружылі яе», — паведаміў ён.

Гэты від акулы аказаўся бяспечным для людзей, і ратавальнік не мог «дазволіць натоўпу пакалечыць бедалажку». Ён на руках перанёс яе на большую глыбіню і адпусціў.

ПАВЫШАНЫ ТАРЫФЫ НА ПАСЛУГІ ЭЛЕКТРАСУВЯЗІ

У Беларусі ў сярэднім на 7 працэнтаў павышаны тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання для насельніцтва, юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь № 153.

У прыватнасці, тарыфы для насельніцтва на тэлефонныя размовы у межах вобласці павысіліся на 6,8 працэнта, у межах краіны — на 7 працэнтаў і склалі адпаведна 22 і 43,9 рубля за мінуту.

Таксама на 7,2 працэнта да 1,78 тыс. рублёў у месяц павялічана абаненцкая плата за карыстанне асноўным тэлефонам, пераведзеным на пачасовую аплату, і на 6,9 працэнта да 2,8 тыс. рублёў — за карыстанне тэлефонам, не пераведзеным на пачасовую аплату. Кошт кожнай поўнай і няпоўнай хвіліны званка ў межах населенага пункта для фізасобаў павышаны на 6,9 працэнта да 8,61 рубля. Акрамя гэтага, на 6,5 працэнта да 490 рублёў у месяц вырасла абаненцкая плата за карыстанне радыёкропкай.

Для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў кошт размовы ў межах вобласці вырас на 6,8 працэнта да 26,1 рубля за хвіліну, у межах краіны — на 7 працэнтаў да 52 рублёў за хвіліну. Кошт установкі тэлефона для бюджэтных арганізацый не змяніўся і складае 156 тыс.рублёў, для юрыдычных асобаў і ІП — 290,16 тыс рублёў.

Тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання перагледжаны штогод. Апошнім разам у Беларусі яны былі перагледжаны ў снежні 2006 года.

Кар. БЕЛТА.

Нацбанк купіць камяні. Каштоўныя

У хуткім будучым Нацыянальны банк пачне выкупляць у насельніцтва атэставаныя брыльянты, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка «Гемалагічнага цэнтра» Нацыянальнага банка Дзяніс Хадарцэвіч. Не выключана, што падобная магчымасць прадаставіцца трымальнікам каштоўных камянёў ужо напрыканцы сёлетняга года.

Як паказала практыка, попыт на атэставаныя брыльянты, продаж якіх Нацбанк пачаў у канцы 2005 года, расце з году ў год. «Звязда» ўжо паведамляла, што за 8 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам аб'ём продажу брыльянтаў у каратах вырас на 85 працэнтаў. Магчыма, не апошнюю ролю тут адыграў і той факт, што капіталаўкладанне ў каштоўныя камяні з'яўляецца даволі надзейным сродкам зберажэння, а сама здзелка застаецца канфідэнцыяльнай. Што датычыцца надзейнасці такога ўкладання, то цэны на брыльянты апошнім часам толькі растуць, прыбаўляючы штогод ад 3 да 8 працэнтаў да свайго кошту. А цяпер адносна зваротнага выкупу каштоўных камянёў.

— Нарматыўна-прававая база, якая б дазваляла ажыццяўляць выкуп каштоўных камянёў, у нас існуе, — патлумачыў у гутарцы Дзяніс Хадарцэвіч. — Адзінае, што шэраг палажэнняў, якія рэгулююць зваротны выкуп, будуць уступаць у сілу на падставе асобнага рашэння Савета дырэктараў. Зараз жа рыхтуецца тэхнічная база да гэтага працэсу. На першапачатковым этапе выкуп брыльянтаў будзе праводзіцца ў Галоўным упраўленні Нацыянальнага банка па Мінску і Мінскай вобласці. Менавіта тут будзе ажыццяўляцца і экспрэс-ідэнтыфікацыя камянёў. Прычым будуць выкупляцца толькі атэставаныя брыльянты Нацыянальнага банка, спецыяльная ўпакоўка якіх не ўскрыта і якія суправаджаюцца атэстатам якасці. Такім чынам, пры жаданні кліента вярнуць брыльянт і атрымаць грошы ён павінен будзе прыйсці ў Галоўнае ўпраўленне Нацыянальнага банка па Мінску і Мінскай вобласці. Як мяркуецца, выкуп будзе праводзіцца ў пэўныя дні тыдня.

— Цікава, з якой мэтай большасць людзей купляюць брыльянты ў банку? Ці праводзілі вы нейкі аналіз?

— Такой статыстыкі няма: мы не вядзём яе і не адсочваем далейшы шлях камянёў. А вось калі меркаваць па тых водгуках, якія мы чуем, то людзі задаволеныя якасцю брыльянтаў, і многія купляюць іх з мэтай вырабу ўпрыгажэнняў. Рэальна гэта атрымліваецца дзесьці на 40 працэнтаў танней, чым купляць таго ж плану вырабы у магазіне.

— Сёння выгадна ўкладваць грошы ў брыльянты?

— Усё залежыць ад кан'юнктуры цэнаў. У нас раз у квартал пераглядаецца кошт брыльянтаў, зыходзячы з той цаны, па якой іх атрымлівае банк. Так, ёсць пэўная тэндэнцыя да росту іх кошту, цаны рэалізацыі брыльянтаў. Калі раней у нас на некаторыя камяні цана складала каля 30—31 долара ЗША, то мінула два гады і аналагічныя каштуюць ужо 39—40 долараў.

— А наколькі вялікай будзе розніца паміж продажам камянёў Нацбанкам і іх зваротным выкупам?

— Гэтае пытанне знаходзіцца ў стадыі абмеркавання. Натуральна, маржа будзе, як яна ёсць і пры зваротным выкупе каштоўных металаў. Якая? — пакуль не вызначана.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Аўтавыстава

На свята ўсюдыходаў завітаў і беларускі «Алігатар»

«Джыпы» акупавалі «Белэкспа»

Усе шляхі аматараў язды па бездарожжы зараз вядуць у Мінск. А дакладней, у НВЦ «Белэкспа», дзе ўчора пачалася спецыялізаваная выстава «Off Road. Minsk». Трапіць на гэты парад усюдыходаў імкнуліся не толькі салідныя аўтадылеры (пад дахам Нацыянальнага выставачнага цэнтра прадстаўлена больш за 40 мадэляў сучасных «джыпаў»), але і некаторыя беларускія Кулібіны.

Напрыклад, майстар вытворчага навучання ПТВ № 169 з гарадскога пасёлка Відзы Міхаіл Смірноў прыехаў на незвычайным усюдыходзе «Форд Алігатар» (на здымку). Адметна, што па дарозе ў Мінск яго ніводнага разу не спынілі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Па словах Міхаіла Смірнова, «даішнікі» толькі здзіўлена глядзелі ўслед. І сапраўды, тое, што Міхаіл Міхайлавіч разам з навучэнцамі памянёнага ПТВ сабраў сваімі рукамі, па ўласных чарцяжах, інакш як цудам тэхнікі не назавеш. Прычым, збіралі як у прамым так і ў пераносным сэнсе слова. Кузаў у «Алігатара» сапраўды «фордаўскі», знайшлі яго абгарэлым і нікому не патрэбным, астатнія вузлы і дэталі — ад вайсковага грузавіка «ГАЗ-66», «Масквіча» і «Волгі». Такі вось і атрымаўся амерыкана-савецка-беларускі гібрыд. Аўтамабіль, дарэчы, упершыню выконвае ролю «вясельнага генерала». Стыхія «Алігатара» — бездарожжа. У памежных з Латвіяй Відзах гэты ўсюдыход нават выкарыстоўваецца для аховы Дзяржаўнай граніцы. Ад такога «прахадзімца» не ўцячэ нават самы спрытны парушальнік мяжы. На вялікай сталічнай «тусоўцы» элегантных «паркетнікаў» і шляхетных «прахадзімцаў» гэты «асілак», відавочна, адчуваў сябе няёмка. Магчыма таму і ўладкаваўся не пад дахам НВЦ, дзе яму было б крыху цеснавата, а побач з цэнтральным уваходам у будынак «Белэкспа». Насамрэч, як патлумачыў Міхаіл Смірноў, уся справа ў грашах. Нават за месца побач з будынкам выставачнага цэнтра давялося заплаціць 200 еўра, а «паркоўка» ў памяшканні «Белэкспа» для небагатага ПТВ пакуль не па кішэні. Зрэшты, магчыма, праз некаторы час «Алігатар» ці якое-небудзь іншае «дзіця» айчыннага аўтапрама зойме свой пачэсны пасад між сусветна вядомымі ўсюдыходамі. Відзаўскія Кулібіны даказалі, што і беларусы здольныя стварацъ «джыпы» нават з металалому.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07169

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 07.09.2007 г. (для б/н разлікаў)		*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*	
1 долар ЗША	2 148,00	Цэнтрабанк РФ	
1 еўра	2 932,66	USD	25,6639
1 латвійскі лат	4 197,77	10 UAH	51,0217
1 літоўскі літ	849,33	1000 BYR	11,9284
1 чэшская крона	106,14	EUR	35,0210
1 польскі злоты	767,62	*Курс у гандлёвых кампаніях (на 06.09.2007 г.)*	
1 расійскі рубель	83,70	USD	2140 / 2210
1 украінская грыўня	429,58		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасе: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 29 верасня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 кастрычніка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 кастрычніка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 снежня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 верасня 2007 года. Удачы ў гульні!

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на IV квартал 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету _____ (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

пераадрасоўкі _____ руб.

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму _____

Куды _____ (прозвішча, ініцыялы)

_____ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Беларуская АЭС будзе надзейным і высокаэфектыўным аб'ектам

Аб гэтым заявіў намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Цімашпольскі ўчора на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Цяпер вывучаецца 2-3 патэнцыяльныя пляцоўкі для будаўніцтва АЭС, першапачаткова іх было 54. Выбрана будзе самая надзейная, падкрэсліў вучоны. Ён нагадаў, што дзве патэнцыяльныя пляцоўкі знаходзяцца ў Магілёўскай вобласці — Краснапалянская і Кукшынаўская, трэцяя — на захадзе Беларусі. На думку Уладзіміра Цімашпольскага, найбольш верагодна, што станцыя будзе пабудавана ў Магілёўскай вобласці.

Вучоны назваў неабгрунтаванымі некаторыя выказванні аб тым, што на пляцоўках у Беларусі можа не падысці грунт для будаўніцтва АЭС. «Беларусь уся ўсеяна азёрамі, аднак гэта не азначае, што нельга будаваць ніякіх будынкаў. Іншая справа, што павінны прымацца меры для забеспячэння дадатковай бяспекі будаўніцтва», — падкрэсліў ён. У свеце сярэдняя цана на ўстаноўлены кілават АЭС пры ідэальнай пляцоўцы складае каля $1,6 тыс., у Беларусі гэты паказчык можа быць на ўзроўні $2 тыс. Беларуская пляцоўка не ўступае па бяспецы пляцоўкам, на якіх будуць будавацца АЭС у Балгарыі, Расіі, дадаў ён.

Уладзімір Цімашпольскі падкрэсліў, што ўзвядзенне АЭС у Беларусі з'яўляецца важным фактарам узмацнення энергетычнай бяспекі краіны і замяшчэння імпартуемых энергарэсурсаў.

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

Пасля пісьма

«НА КАНТРОЛІ» — ГЭТА АБНАДЗЕЙВАЕ

На нашу долю, долю сённяшніх састарэлых, — пісаў у рэдакцыю сп. Коршун з в. Ліпаўкі Ушацкага раёна, — выпала вельмі шмат выпрабаванняў. Мы прайшлі вайну, пасля яе, за бесцань, на сабе аралі і баранавалі, падымалі гарады і калгасы, бохан хлеба купіць не маглі, але выстаялі. Цяпер нам своечасова прыносяць пенсіі, у вёску два разы на тыдзень прыязджае аўталаўка... А вось з сувяззю праблемы ёсць. Хочаш заказаць балон, выклікаць хуткую, а тэлефон не працуе...

Як паведаміла ў адказ на гэты зварот намеснік старшыні Ушацкага райвыканкама сп. Карчэўская, тэлефон заяўніка ўключаны па спаранай схеме. Агульная працягласць лініі (падземнай кабельнай і паветранай на драўляных апорах) складае 6,4 кіламетра. З 6 па 8 чэрвеня тэлефон не працаваў з-за няспраўнасці падземнага кабеля, 4 ліпеня — з-за няспраўнасці блакіратара... У 2009 годзе РУП «Белтэлекам» плануе расшырэнне АТС, пры якім паветраная лінія сувязі «Сарочына—Ліпаўкі—Лясneўшчына» будзе заменена на кабельную, што значна палепшыць якасць работы тэлефона. Пакуль жа на свой кантроль яе ўзяў раённы вузел электрычнай сувязі.

Шайбу, шайбу!

«Юнацтва» разграміла ўладальнікаў Кубка Беларусі

У сераду стартаваў 16-ты чэмпіянат Беларусі па хакею з шайбай. У параўнанні з мінулымі першынствамі гэты турнір пазбаўлены статусу адкрытага (раней у чэмпіянаце Беларусі спаборнічалі каманды з Латвіі і Украіны).

І ўсё ж спаборніцтвы ў экстралізе будуць цікавымі дзякуючы з'яўленню ў ёй хакеістаў, якія выступалі ў Еўропе і Расіі і нават далёкім замежжы. У прыватнасці, склад уладальнікаў Кантынентальнага кубка, мінскага «Юнацтва» папоўнілі беларусы Віктар Касцючонак і Сяргей Шабанаў, а таксама канадскі легіянер Лукас Лоусан, «Гомеля» — Сяргей Задзялёнаў, жлобінскага «Металурга» — Андрэй Башко і Сяргей Кукушкін. Галоўнымі прэтэндэнтамі на перамогу з'яўляюцца «Гомель», які ў сезоне заваяваў ужо некалькі трафеяў — Кубак Беларусі і кубак Сяброўства, а таксама мінскія «Юнацтва» і «Керамін». Наконт сталічнага «Дынама» сказаць цяжка: залаты склад чэмпіёнаў мінулага сезона пакінула асноўная частка ігракоў.

На першым этапе 10 каманд згуляюць у шэсць кругоў. Васьмёрка мацнейшых выйдзе ў плей-оф. Барацьба ў чвэрцьфінале і паўфінале вядзецца да трох перамог, у галоўным матчы — да чатырох.

Вынікі матчаў першага тура не надта здзівілі. Мабыць, толькі разгром сталічным «Юнацтвам» гамяльчан (8:1), дзеючых уладальнікаў Кубка краіны. Іншыя сустрэчы завяршыліся так: «Дынама» (Мінск) — «Металург» (Жлобін) — 2:1,»Брэст" — «Хімік-СКА» (Наваполацк) — 1:3. У гульні гродзенскага «Нёмана» і «Віцебска» была зафіксавана нічыя ў асноўны час і ў авертайм (2:2), аднак з гэтага сезона пры роўным ліку выконваюцца буліты. Першым пераможцам паводле новых правілаў стаў «Віцебск» — 3:2.

Чэмпіён прадстаўляе Міншчыну

Днямі быў выбраны старшыня Папячыцельскага савета ХК «Дынама». Ім стаў Андрэй Пазняк, намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. З новага сезона «бела-блакітныя» афіцыйна стануць камандай Мінскай вобласці, хоць і захаваюць сваю назву «Дынама-Мінск», бо яна ўжо стала брэндам, які ведаюць ва ўсім хакейным свеце. «Дынама» таксама будзе прадстаўляць усе сілавыя структуры, акрамя Міністэрства абароны. Месяц дынамаўцы будуць выступаць на арэне Лядовага палаца па вуліцы Прытыцкага, дзе звычайна праходзяць матчы мінскага «Кераміна». У сталічны Палац спорту каманда вернецца прыкладна ў кастрычніку.

— Змянілася кіраўніцтва клубам, — нагадаў старшыня цэнтральнага савета БФСГ «Дынама» Юрый Бародзіч. — Рашэннем Прэзідэнта ў новым сезоне ХК «Дынама» вярнуўся да гістарычнага ўласніка — БСФГ «Дынама». Акрамя таго, змянілася сама канцэпцыя развіцця клуба. Мы будзем ствараць усю сістэму: асноўная і другая каманды — дзіцяча-юнацкая школа — лядовая арэна. Калі дзіцяча-юнацкая школа «Дынама» дзейнічае ўжо два гады (у ёй займаецца каля 200 дзяцей), то пытанне ўласнай арэны ў дынамаўцаў дасюль актуальнае. Паводле слоў Юрыя Фёдаравіча, якраз зараз кіраўніцтва клуба заклапочана выдзяленнем зямельнага ўчастка (хутчэй за ўсё ў раёне станцыі метро «Магілёўская»).

— Кіраўніцтва аблвыканкама зацікаўлена, каб каманда «Дынама» захавала свае традыцыі, — заўважыў Андрэй Пазняк. — Каб стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу, пашыраны спіс спонсараў. Імі будуць прадпрыемствы Міншчыны, у прыватнасці «Беларускалій».

У новым сезоне чэмпіёны не ставяць галоўнай мэтай заваяваць «золата», хоць гэтаму будуць рады. «Па-першае, нам трэба выйсці ў плей-оф, — кажа галоўны трэнер каманды Андрэй Сідарэнка. — Склад ігракоў змяніўся на 80 працэнтаў...».

Ірына ПРЫМАК.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

Грошы за малако аддадуць

Малаказдатчыца Таццяна Аляксандраўна Платановіч з вёскі Залессе Смаргонскага раёна паскардзілася ў рэдакцыю, што з вяскоўцамі не разлічыліся за здадзенае ў першай палове жніўня малако.

Начальнік аддзела эканомікі ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Смаргонскага райвыканкама Аляксандр Страпко напачатку вельмі здзівіўся нашаму звароту: маўляў, гэтага не можа быць, праблем з разлікамі за здадзенае насельніцтвам малако няма. Але затым, праверыўшы інфармацыю, мусіў прызнаць: прыватнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Агінскае» сапраўды не выплаціла грошы насельніцтву за малако за першую палову жніўня. Віны малаказавода няма, ён своечасова пералічыў сродкі.

«Праблема звязана з галоўным бухгалтарам гаспадаркі, — удакладніў Аляксандр Сцяпанавіч, — у адносінах да якога мы будзем праводзіць разбіральніцтва. А грошы малаказдатчыкам будуць выплачаны літаральна заўтра».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Тэму далучэння Заходняй Беларусі да БССР чакае вялікая ўвага?

Да тэмы далучэння Заходняй Беларусі да БССР у 1939 годзе ў бліжэйшыя гады «будзе прыцягнута ўвага вельмі вялікіх сіл» свету. Такую думку выказаў учора першы намеснік начальніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення інфармацыі Міністэрства абароны Уладзімір Макараў падчас пасяджэння круглага стала «Праўда і хлусня аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР (верасень 1939 года)».

Паводле слоў Уладзіміра Макарава, увага да тэмы далучэння тлумачыцца будучым 70-гадовым юбілеем гэтай падзеі, а таксама юбілеем пачатку другой сусветнай вайны. Пры гэтым прадстаўнік Міністэрства абароны патлумачыў, што будзе прыцягнута ўвага сіл, «якія і сёння спрабуюць раскачваць сітуацыю, і сёння дэстабілізаваць абстаноўку. І сёння ўносіць супярэчнасці... ў адносінах Беларусі з іншымі дзяржавамі, у тым ліку з Польшчай».

«Але тут гістарычная праўда — на нашым баку. Гэта спрадвечна беларускія землі, яны будуць заўсёды належаць Беларусі», — дадаў Уладзімір Макараў. Прадстаўнік Міністэрства абароны дадаў таксама, што сёння, згодна з ваеннай дактрынай, Беларусь не разглядае Польшчу (як і ўсе іншыя краіны) у якасці патэнцыйнага праціўніка. «Мы не разглядаем Польшчу ў якасці праціўніка. І не разглядалі. Мы памятаем гераізм палякаў, якія ўдзельнічалі ў барацьбе з фашызмам... Вызваленне з-пад фашысцкага іга прынесла Чырвоная Армія і зноў створанае Войска Польскае, удзельнікі польскага антыфашысцкага супраціву».

Паводле слоў намесніка старшыні савета ваенна-навуковага таварыства пры Цэнтральным доме афіцэраў Узброеных Сіл Ігара Пахлопкі, «ужо 68 гадоў беларускі народ жыве і працуе ў адзінай сям'і. У барацьбе з фашызмам ён адстаяў свабоду і незалежнасць сваёй радзімы. Унёс дастойны ўклад у разгром фашысцкай Германіі і яе сатэлітаў. Аднавіў разбураную вайной народную гаспадарку. Зрабіў савецкую Беларусь квітнеючай рэспублікай. І ўсё робіць наш народ для будаўніцтва моцнай, магутнай і квітнеючай Беларусі».

У той жа час «гэта не задавальняе нашых праціўнікаў. Працягліы час яны вядуць сапраўдную інфармацыйную вайну супраць Расіі, Беларусі, народаў былога СССР, імкнучыся прыпісаць ЗША, Англіі, Францыі асноўную заслугу ў дасягненні перамогі над фашызмам. Абвясціць Савецкі Саюз такім жа, як Гітлер, агрэсарам... Не засталося без іх увагі і абмяркоўваемае намі пытанне. Асабліва шчыруюць у галіне перайначвання гісторыі некаторыя дзяржавы і грамадскія колы, гісторыкі і журналісты» шэрагу ўсходнееўрапейскіх краін і краін Балтыі.

На «круглым стале» прагучала прапанова абвясціць 17 верасня дзяржаўным святам Беларусі. Да гэтага, дарэчы, заклікала «Звязда» ўжо на працягу многіх гадоў.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Спорт—тайм

ТРЭНЕРА «СМАРГОНІ» ПАКАРАЛІ

Чатыры матчы дыскваліфікацыі і штраф у памеры 20 базавых велічынь — менавіта такое пакаранне вынес дысцыплінарны камітэт БФФ галоўнаму трэнеру футбольнай каманды «Смаргонь» Георгію Кандрацьеву.

Настаўнік паводзіў сябе неэтычна ў дачыненні да сапернікаў з жодзінскага «Тарпеда» і суддзі Антуана Маёрава. Трэнер нават кінуў бутэльку з вадой у бок лаўкі запасных жодзінцаў, бо быў не згодны з назначаным пенальці.

ПРАЛЯЦЕЛІ

У заключным адборачным матчы чэмпіянату Еўропы па баскетболу ў дывізіёне «Б» мужчынская зборная Беларусі ўступіла англійскай камандзе — 51:83. Падначаленыя Аляксандра Барысава згубілі шанц выйсці ў дывізіён «А».

«ШАХЦЁР» СУПРАЦЬ «МІНСКА»

Адбыўся перанесены матч 1/16 фіналу Кубка Беларусі па футболу. У Магілёве мясцовы «Савіт» прымаў салігорскі «Шахцёр». Госці забілі па мячу ў кожным тайме і выйшлі ў 1/8 фіналу розыгрышу, дзе сустрэнуцца з «Мінскам».

ПЯЦЬ ГАДОЎ РАЗАМ З МОЛАДДЗЮ

Учора самая масавая маладзёжная арганізацыя Беларусі БРСМ адзначала пяцігадовы юбілей. У Мінску прайшоў рэспубліканскі актыў БРСМ «5 гадоў разам», прысвечаны гэтай знамянальнай даце. У ім удзельнічалі дэлегацыі Сірыі, Венгрыі, Расіі, Грузіі, Украіны, Арменіі, пасол Венесуэлы, ветэраны моладзевага руху дзяржавы.

Упершыню адбылося ўзнагароджванне нагрудным знакам ГА «БРСМ» «За поспехі ў працы» маладых спецыялістаў прамысловых, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія дабіліся высокіх вынікаў у працы, актыўна працавалі з Саюзам моладзі. «Я ўпершыню знаходжуся на такім вялікім свяце. Сёння маю працу адзначылі ўзнагародай. І хочацца сказаць, што моладзь у вёсцы не баіцца плённай працы, яна актыўна ўдзельнічае ў жыцці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, дапамагае пенсіянерам», — гаворыць старшыня СПК «Рубежніца» Віцебскай вобласці Сафія Вараб'ёва, якая з'яўляецца сакратаром пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» гэтай гаспадаркі.

— За гэты час саюз вырас, зараз у яго склад уваходзіць больш чым 430 тысяч моладзі. БРСМ — самая шматлікая арганізацыя, аналагаў якой няма на постсавецкай прасторы, — адзначыў першы сакратар ЦК ГА БРСМ Леанід Кавалёў.

Надзея БАС.

У ГЛУШЫ БУДЗЕ МУЗЕЙ АДАМОВІЧА

У пасёлку Глуша Бабруйскага раёна, дзе нарадзіўся вядомы беларускі пісьменнік і публіцыст Алесь Адамовіч, у будучым з'явіцца музей.

Экспазіцыю пра жыццё Адамовіча, яго творчасць і родную Глушу плануецца размясціць у драўляным будынку былой аптэкі, загадчыцай якой калісьці была маці пісьменніка Ганна Мітрафанаўна. Аптэка ў Глушы зачынілася гадоў дзесяць таму, і нядаўна ўзніклі пагалоскі, што будынак могуць разабраць на дровы. Тады дачка Алеся Адамовіча Наталля прапанавала ўладам адкрыць у былой аптэцы музей. Ідэю падтрымалі ў Бабруйскім райвыканкаме і ў аддзеле культуры Магілёўскага аблвыканкама. Цяпер робіцца перадача будынка аптэкі ад міністэрства аховы здароўя ў камунальную ўласнасць Бабруйскага раёна. Мяркуецца, што ў будучым годзе знойдуцца сродкі, каб адрамантаваць будынак і зрабіць добраўпарадкаванне.

Алена КАЗЛОВА.

Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Минскэнерго» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»

проводят открытый аукцион на право заключения договора аренды сроком на 5 лет нежилых помещений, расположенных на первом этаже ведомственного общежития по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 13, к. 2. Общая нормируемая площадь (помещений бывшего буфета) 110 кв.м. Начальная цена права аренды 5794 530 рублей.

Размер задатка составляет 10 % от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок подачи документов и проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Сроки оплаты за право аренды устанавливаются протоколом о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке не позднее 30 дней после завершения торгов и подписания протокола. **Помещение сдается в аренду под производственное целевое использование — бытовые услуги или услуги общепита.**

Аукцион состоится **19 сентября 2007 г. в 12.00.** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18 сентября 2007 г. до 16.00. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Контактные телефоны: (8-017) 227- 40- 22, 50-60-313.

ОАО «Белэнергострой» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже здания магазина № 5 «Гастроном» (общ. пл. 1095 кв.м), расположенного по адресу: Пуховичский р-н, п. Дружный, ул. Чепика, 14. Площадь земельного участка 0,2130 га. Начальная цена лота – 650 000 000 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 5% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 09.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, 234909.
Сайт в Интернете: www.rlt.by**

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА IV КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насцярэжы Чарнобылю
Наши культурные исторрулс

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — газета для выбарщыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
СВАЯ СПРАВА — бізнэс, эканоміка, фінансы
ЖЫВАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! таўары паслугі цэны
Край на здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8200 рублёў на месяц 24600 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7850 рублёў на месяц 23550 рублёў на квартал
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13000 рублёў на месяц 39000 рублёў на квартал
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11850 рублёў на месяц 35550 рублёў на квартал

РАСЦІ ВЯЛІКІ, БЕЛАГРАПРАМБАНК!

Памятаю адну школьную традыцыю: некалькі разоў на год праводзіць так званы дзень імянінніка — віншаваць адразу ўсіх дзетак, у якіх дзень нараджэння ў адну пару. Такое ж свята наладзілі на пачатку верасня ў Мінскім абласным філіяле Белаграпрамбанка.

Найстарэйшым імяніннікам аказаўся сам банк — 3 верасня яму споўнілася 16 гадоў. Ён ужо досыць самастойны юнак, а вось астатнія шасцёра «віншаванцаў» — ва ўзросце ад 2 да 13 гадоў. Хтосьці з іх адсвяткаваў дзень нараджэння 31 жніўня, а нехта зробіць гэта толькі 9 верасня, аднак усіх аб'ядноўвае адно: на імя кожнага з іх у Белаграпрамбанку адкрыты ўклад. Крыху пра ўмовы: трэба ўнесці не менш за мільён беларускіх рублёў (ёсць магчымасць зрабіць уклад у доларах, еўра і расійскіх рублях) тэрмінам звыш 500 дзён і аформіць на дзіця ва ўзросце да 16 гадоў уключна. Суму ўклада можна папаўняць, а тэрмін — падаўжаць (па заканчэнні абранага). Тыя, хто адкрые ўклад сёлета з 1 чэрвеня па 31 снежня, стануць удзельнікамі акцыі «Расці вялікі!», а гэта значыць, што такім маленькім укладчыкам гарантаваны падарунак ад банка на кожны дзень нараджэння.

Дзеля, якім банк дапамагае расці вялікімі, ужо 1750 па ўсёй краіне. А больш за ўсё пашанцавала тым, хто з'явіўся на свет на пачатку восені — калісьці ў гэты час пачаў працаваць «Белаграпрамбанк», а сёлета ён ушаноўвае самых маленькіх і самых дарагіх укладчыкаў.

Прыязнымі гаспадарамі на калектыўным дні нараджэння ў Мінскім абласным філіяле былі супрацоўнікі Белаграпрамбанка (балазе, было што паказаць — нядаўна адбудаваную залу абслугоўвання кліентаў, выдатна аснашчаную, з сістэмай электроннай чаргі, дзе і прайшлі ўрачыстасці), а шчодрымі на падарункі гасцямі — **дырэктар Гармалзавода № 3 Ніна Доліч і галоўны бухгалтар Клецкага масларобчага камбіната Жанна Міхалап**, якія парадавалі імяніннікаў прадукцыяй сваіх прадпрыемстваў. Кепачкі, рукзачкі і дарожныя сумкі з сімволікай «Белаграпрамбанка» ўручыў дзеткам, напэўна, самы «салодкі» персанаж — папугай Гоша. Павіншаваў малых і **начальнік галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка па Мінску і Мінскай вобласці Васіль Палонскі.**

Паветраных шарыкаў і пакетаў з падарункамі было столькі, што дзеці літаральна хаваліся за імі. Самыя смелыя з іх **(Андрэй Цяглік і Каця Булынка)** таксама парадавалі гасцей — расказалі забаўныя вершыкі. Асабліва ўсім запомніліся кранальныя сваёй непасрэднасцю Каціны словы: «Вы чаму ўсю ноч не спалі? Мы Кацюшу віншавалі!»

Больш за іншых пашанцавала **Андрэю Цяглiку** — яму споўнілася 7 гадоў акурат у дзень уручэння падарункаў ад «Белаграпрамбанка». Алена Цяглік — пастаянная кліентка банка, усе камунальныя паслугі аплачвае менавіта тут — лічыць акцыю цудоўнай магчымасцю забяспечыць будучыню сына:

— Пакуль мы ўнеслі мінімальную суму, але абавязкова будзем папаўняць уклад. Працэнты не здымаем — няхай ідзе капіталізацыя, да Андрэевага паўналецця чапаць не збіраемся. Цяжка пакуль загадваць, на што давядзецца патраціць грошы... Магчыма, на адукацыю.

Пра тое, як узнікла сама ідэя такой акцыі, расказвае **эканаміст аддзела маркетынгу Марына Калацкая:**

— Мы пастаянна падкрэсліваем, што Белаграпрамбанк прадастаўляе паслугі ўсім, незалежна ад узросту, сацыяльнага статусу, матэрыяльнага становішча і інш. Аднак да з'яўлення акцыі «Расці вялікі!», дзеці, па сутнасці, не мелі ніякага дачынення да банка — хіба што прыходзілі разам з бацькамі, назіралі за працай касіраў, толкам не разумеючы, навошта ўсё гэта патрэбна. Зусім іншая справа цяпер, калі яны ведаюць, што ў банку захоўваюцца грошы, афармленыя на іх, а не на маму ці тату. Да таго ж, заўжды прыемна атрымліваць падарункі ў дзень нараджэння. Мы заўсёды праводзім гэту акцыю ўрачыста — маленькая свята падабаецца і нашым маленькім укладчыкам, і дарослым кліентам, якія ў гэты час аказваюцца ў банку.

Акрамя фінансавага аспекту ў дзейнасці банка важны і сацыяльны. Пра гэта згадаў у сваёй прамове **Аляксандр Мяжэвіч, начальнік Мінскага абласнога філіяла:**

— Белаграпрамбанк прымае актыўны ўдзел у сацыяльных праграмах, мы ўносім сваю лепту ў адраджэнне сяла, крэдытуем будаўніцтва жылля для насельніцтва: толькі па Мінскай вобласці на гэта было выдаткавана 200 млрд рублёў. Неабыякавыя мы і да паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне — нездарма ў Год дзіцяці праводзім акцыю «Расці вялікі!» Сёння мы віншуем тых, чый дзень нараджэння супаў з днём нараджэння банка, — самых маленькіх і самых перспектыўных нашых укладчыкаў.

Яшчэ раз віншуем усіх «восеньскіх», няхай расце вялікім «Белаграпрамбанк» і яго малыя кліенты.

**Ала МАЧАЛАВА.
Фота аўтара.**

РАДЗІННАЕ

Захаваць традыцыі або... пайсці іншым шляхам?

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 31 жніўня, 3—6 верасня.)

ЗАГС і рынак паслуг: час патрабуе ініцыятыў

У наш час стыхійны рынак паслуг усё больш актыўна захопліває нішы свайго ўплыву, прапаноўвае шырокі выбар канкурэнтаздольнага тавару. Вяселле не стала ў гэтым шэрагу выключэннем. Вясельны бізнэс знаходзіцца ў стадыі станаўлення. А як вядома, гэты перыяд заўсёды мае супярэчлівы, часам непрадказальны характар, хоць асноўныя тэндэнцыі яго разумелыя і выразныя. Вясельны бізнэс, як і іншыя сферы эканамічнага і сацыяльнага жыцця грамадства, падпарадкаваны тэндэнцыям глабалізацыі з выразным еўрапейскім адценнем і амерыканскімі атрыбутамі фінансавай самадастатковасці, што ў перакладзе на простую мову азначае «не толькі хлеба, але і відовішчаў». З навамоднымі тэндэнцыямі змагацца бессэнсоўна: панацэі ад іх не было і не будзе. Таму такія навацыі неабходна прымаць як фактар рэчаіснасці. Для адных яны — пацеха для душы, знак матэрыяльнай акрыленасці, істотнай перавагі над «прымітыўнасцю» бацькоўскіх парадкаў і традыцый, знак прыналежнасці да больш высокага грамадскага саслоўя. І гэта зразумела. Усё жыццё нашы прадзеды імкнуліся зарабіць «капейку», каб купіць большы надзел зямлі і адчуць сябе гаспадаром-уласнікам. Сёння іх праўнукі атрымалі магчымасць рэалізаваць спадзяванні продкаў. Хацелася б толькі аднаго: каб нашы заможныя хлопцы хоць крыху ўдзялялі ўвагі памяці аб традыцыях сваіх дзядоў, каб іх бережліва захоўвалі і перадалі сваім унукам.

Таму паралельна з агрэсіўнымі замежнымі навацыямі хацелася б і надалей культываваць традыцыйныя каштоўнасці свайго народа. Аднак рабіць гэта неабходна не на прымітыўным узроўні, а з улікам усё тых жа рынкавых адносінаў. Нашы шматлікія вясельныя салоны прапаноўваюць сёння практычна ўвесь комплекс паслуг: адзенне, аксесуары, фота- і відэаздымкі, афармленне залы, а таксама арганізатараў вясельнага застолля. Аднак у пераважнай большасці салоны адкрывалі людзі, якія мелі выдатныя арганізатарскія здольнасці, неабходныя сувязі, аднак не мелі адпаведных ведаў у галіне народных традыцый. Яны ішлі навобмацак, хацелі як мага лепш, але ж... не ўсё тое золата, што блішчыць.

З гэтага вынікае цалкам заканамерны вывад і, як нам падаецца, канструктыўная прапанова:

Патрэбны своеасаблівы каардынацыйны цэнтр, у склад якога маглі б увайсці прадстаўнікі ЗАГСаў, кіраўнікі салонаў і цэнтраў народных промыслаў і рамёстваў. Менавіта такі кансорцыум аб'яднае ў сабе ўсе найважнейшыя складовыя менеджменту ў разглядаемай сацыякультурнай сферы дзейнасці.

ЗАГС пакуль што міжволі ўцягвае і яшчэ доўга будзе ўцягваць у поле сваёй дзейнасці вялікую колькасць спажыўцоў сацыяльнага заказу на правядзенне вясельнай урачыстасці. Верагодна, што гэтаму працэсу лепш было б надаць мэтанакіраваны, а не хаатычны характар рынкавага выжывання. У рэшце рэшт, няхай салоны прапаноўваюць сваю прадукцыю (ленты з надпісамі «сведка», «сваха» і г. д.), а, скажам, цэнтры народнай творчасці прапаноўвалі б свае паслугі, якія былі б выкананы на ўмовах індывідуальнага заказу. Маладым людзям не трэба было б бегаць па крамах і купляць абы-якія ручнікі (усё роўна яны не ведаюць сутнасці закадзіраванай у іх інфармацыі-сімволікі). Дастаткова было б зайсці ў Цэнтр рамёстваў і з улікам сваіх фінансавых магчымасцяў заказаць усё неабходнае: ручнікі для провадаў нявесты, сустрэчы маладых, для святоў, шафераў, той, на якім будуць стаяць у храме. Сюды ж будуць уваходзіць паясы, хусцінкі, званочкі, упрыгажэнні для вясельнага картэжа. А магчыма, нехта з маладых пажадаў бы заказаць для шлюбу такое адзенне, у якім некалі вянчалася іх бабуля або дзядуля? А чаму б побач з амерыканскім лімузінам каля ЗАГСа не прыпаркавацца «фурманкам» або «радзівілаўскім карэтам», якія потым павезлі б людзей у рэстаран, прыбраны традыцыйнымі беларускімі атрыбутамі, не кажучы ўжо пра святочны стол, упрыгожаны вытанчанымі стравамі беларускай кухні. Не ўяўляю чалавека, які не пусціўся б у скокі, калі б у зале зайгралі скрыпка, бубен і цымбалы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зразумела, што працэс удасканалення будзе вечным, таму неабходна літаральна па дэталях прааналізаваць абрад рэгістрацыі і ўнесці шэраг удакладненняў, пачынаючы, магчыма, з самага нечаканага: а ці мае права рэгістраваць шлюб той супрацоўнік, які сам скасаваў шлюб? Пытанне далёка не адназначнае.

Час ад часу ў ЗАГСе здараюцца непрадказальныя рэчы. Балюча бывае, калі раптам пярсцёнак аднаго з маладых, пасля няўдалай спробы надзець яго на палец, падае і ляціць на падлогу, а то і коціцца па зале аж да самых дзвярэй (бачылі такое на свае вочы). У народзе гэта прыкмета ўспрымаецца адназначна: «жыць у пары не будуць». Тады ці не лепш падаваць пярсцёнкі на невялічкім сподачку з жытам? Яго маглі б падносіць маладым хросныя бацькі. У выпадку неасцярожнасці аднаго з партнёраў пярсцёнак неўпрыкмет і без лішняга шуму ўпаў бы на зерне, а прысутныя не заўважылі б недарэчнасці.

Адным з найбольш цікавых накірункаў у дзейнасці ЗАГСаў можа стаць і далейшая распрацоўка сцэнарыяў па правядзенню юбілейных вясельных урачыстасцяў. Яны могуць праводзіцца ў дакладна вызначаны дзень або напярэдадні вялікіх народных, царкоўных і дзяржаўных святаў. Іх правядзенне можа адбывацца адначасова з рэгістрацыяй маладажонаў. Зразумела, што юбілейнае вяселле, асабліва залатое, — гэта грамадская падзея, таму да яе правядзення неабходна задзейнічаць самыя розныя грамадскія арганізацыі, камісіі, камітэты. Акрамя таго, да ўрачыстасці будзе далучана шырокае кола свайкоў, блізкіх сяброў, калег па працы, службе. Аднак за гэтым знешне-атрыбутыўным антуражам неабходна бачыць перш за ўсё духоўна-эстэтычны і выхаваўча-гістарычны пачатак.

Асобна для юбіляраў можна распрацаваць праект памятнага медаля, альбом, у якім будуць адлюстраваны ўсе асноўныя моманты юбілейнай урачыстасці. Такія падзеі павінны шырока асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі.

Такім чынам, праз пэўны час ЗАГС мог бы стаць не проста афіцыйнай канторай, якая пад чарговым нумарам рэгіструе акт стварэння новай сям'і, а ўнікальным культурным, асветніцкім, прапагандысцкім цэнтрам, які будзе акумуляваць сацыяльна-прававы, псіхолага-педагагічны, гісторыка-культурны вопыт папярэдніх пакаленняў і, адпаведна, генерыраваць ідэі, накіраваныя на захаванне і ўмацаванне сям'і, якая на працягу многіх стагоддзяў была найважнейшым апірышчам выжывання славянскіх народаў, надзейным захавальнікам старажытных традыцый.

**Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.**

1

2

«У звычайным рэжыме», — так адказалі на пытанне «Як працуеце?» на Ашмянскім мясакамбінаце. Вельмі коратка і сцісла. Але будзем пры гэтым мець на ўвазе наступныя даволі красамоўныя факты: на камбінаце нарасцілі аб'ёмы таварнай прадукцыі ў адносінах да 2001 года ў 4,8 раза. Раней тут за год выпускалі 800 тон каўбасных вырабаў, цяпер — 4 тыс. тон. На ім на 100 працэнтаў загрузілі свае вытворчыя магутнасці, а гэтага дасягнулі толькі асобныя мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы краіны. Цяперашнія аб'ёмы камбіната ўжо з вялікай цяжкасцю «змяшчаюцца» ў яго халадзільных камерах, і тут яўна занепакоены тым, куды прыладзіць дадатковыя аб'ёмы, або даведзеныя аб'ёмы прыросту. Адпаведны ж тэхпрацэс, у якім халадзільная гаспадарка займае вельмі важнае месца, не парушыш — гэта адразу адаб'ецца на якасці прадукцыі...

3

ААТ «Ашмянскі мясакамбінат»

У ЗВЫЧАЙНЫМ РЭЖЫМЕ...

4

Вытворчасць і прадукцыя Ашмянскага мясакамбіната адказваюць самым высокім патрабаванням. Прадпрыемства працягвае развівацца далей

Цяперашні дынамізм у рабоце камбіната, тыя ж аб'ёмы, варта нагадаць, былі прадвызначаны прайшоўшым тут мадэрнізацыі перапрацоўчых прадпрыемстваў АПК. З выкананнем адпаведных тэхнічных праектаў ашмянскае прадпрыемства, па сутнасці, нарадзілася нанава. На ім з'явілася сучаснае абсталяванне (ашмянцы пры гэтым падкрэсліваюць плённасць супрацоўніцтва з брэсцкім прадпрыемствам «Компа»: яго абсталяванне для мясаперапрацоўкі ніколькі не ўступае замежным узорамі разам з тым больш таннае), выдатныя тэрмакамеры для вэнджання каўбас, новая вытворчасць па выраб хутказаморажаных мясных паўфабрыкатаў. Цэхі «адзелісяся» ў нержавейку і кафлю, стаў зусім іншым узровень санітарыі. Прадпрыемства ў цэлым выйшла на новы, сучасны тэхналагічны ўзровень. Гэтага ўзроўню тут дасягнулі, дзякуючы таксама напружанай рабоце ўсяго калектыву, і ў першую чаргу — спецыялістаў, якія і выконвалі тое ж перааснашчэнне. «Развіццё камбіната стала справай нашага гонару», — падкрэслівае яго дырэктар Тамара Філіповіч. А мы тут смела дадалі б да гэтых слоў: і справай самога дырэктара. Перш за ўсё яна нямала аддала сіл для таго, каб камбінат стаў такім, якім ён з'яўляецца цяпер.

Аднак усё гэта, па сутнасці, ужо ў мінулым. А жыццё наладжвае новыя экзамены. Ужо вядома: у гэтым годзе нашы мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы наведалі прадстаўнікі Рассельгаснагляду. Наведалі з тым, каб даведацца, наколькі на нашых прадпрыемствах узровень тэхналогіі, санітарна-вытворчыя ўмовы забяспечваюць якасць і бяспеку прадукту. Вядома, гэта датычыла тых прадпрыемстваў, якія экспартавалі сваю прадукцыю на расійскі рынак. А экспарт ашмянцаў у расійскія рэгіёны заўсёды займаў у іх аб'ёмах даволі вялікую долю. Як вытрымалі гэты экзамен ашмянцы? На прадпрыемстве адзначаюць: тут у сувязі з гэтай атэстацыяй практычна ўсю вытворчасць абнавілі. Па сутнасці, быў праведзены капітальны рамонт усіх вытворчых памяшканняў, усіх магутнасцяў камбіната. Замянілі ўсё электраабсталяванне, паравадзяныя камунікацыі; у цэху першаснай перапрацоўкі жывёлы замест часткі страхі зманціравалі арку дзённага асвятлення (і сам працэс лепш бачны, і вытворчай эстэтыкі дабавілася, і электрычнасць эканоміць сталі). У цэхах, і ў першую чаргу ў мясатлушчавым, асноўным цэху прадпрыемства, з'явілася новае тэхналагічнае абсталяванне (замест таго, якое патрабавала замены) — сучаснае і больш прадукцыйнае. А ў выніку разам з удасканаленнем вытворчасці прыбавілі і ў магутнасцях. Закончылі ў гэтым годзе ўзвядзенне новага дэзінфекцыйнага бар'ера, які поўнасцю адпавядае ўсім ветэрынарна-санітарным патрабаванням. Яшчэ некалькі раней наладзілі на сваёй тэрыторыі ўласную аўтамыйку. А варта адзначыць: на Ашмянскім мясакамбінаце маюць немалы парк аўтамабіляў, прычым апошнія абсталяваны спецыяльнымі тэрмакузавамі і халадзільнымі ўстаноўкамі, што гарантуе дастаўку да спажыўцоў дабраякаснага прадукту... Словам, рыхтаваліся да той жа расійскай атэстацыі вельмі сур'ёзна. Як падкрэсліваюць цяпер на камбінаце, зрабілі ўсё, каб не было сорамна перад расіянамі. Прычым з мэтай эканоміі сродкаў, зрабілі ўласнымі сіламі, і без якога-небудзь урону для асноўнай вытворчасці — гэта значыць без яе спынення. Найбольш важкі ўклад ва ўсю гэту справу абнаўлення ўнеслі службы механіка і энергетыка. Атэстацыя ў цэлым, хоць і з асобнымі дробязнымі заўвагамі, прайшла паспяхова.

Ашмянскі мясакамбінат, як ужо добра бачна, і цяпер не спыняецца ў сваім развіцці. Сведчаннем гэтага служыць і тое, што ў яго скарбонцы апошнім часам з'явіліся новыя ўзнагароды. За якасць і асартымент. Гэта, у прыватнасці, некалькі медалёў і бронзавая статуэтка бога гандлю Меркурыя з маскоўскай выстаўкі, дыпломы з 9 рэспубліканскага конкурсу прадукцыі харчавання, а таксама з ужо традыцыйнай у краіне выстаўкі «Тыдзень моды на здароўе», з Бранскай выстаўкі-кірмашу «Садружнасць-2007» і іншыя ўзнагароды.

Мясакамбінат паспяхова прайшоў так званую рэсертыфікацыю, г. зн. пацвердзіў вынікі ранейшай сертыфікацыі на адпаведнасць менеджменту якасці яго вытворчасці высокім патрабаванням міжнародных стандартаў ІСО 9001.

Адным з цяперашніх клопатаў прадпрыемства з'яўляецца стварэнне ўласнай грунтоўнай тавараправоднай сеткі. У сувязі з гэтым варта сказаць: тут, па сутнасці, ужо цяпер маюць гэту сетку ў выглядзе свайго маштабнага фірменнага гандлю, праз які рэалізоўваецца да 15 працэнтаў прадукцыі. Важнейшай задачай калектыву з'яўляецца далейшае зніжэнне затрат на вытворчасць і прадукцыя Ашмянскага мясакамбіната адказваюць самым высокім патрабаванням. Прадпрыемства працягвае развівацца далей

5

6

7

8

9

пуск прадукцыі.

Яшчэ адзін цяперашні клопат прадпрыемства — дапамога сельскім працаўнікам. На час уборачнай кампаніі ў падшэфным калгасе працавала некалькі спецыялістаў камбіната, быў выдзелены трактар, а напярадзе, як гаварылі на прадпрыемстве, — лён, буракі. А яшчэ — традыцыйны ўжо паход на калгасныя палі за камянямі, або іх збор. Штогод работнікі камбіната такі паход наладжваюць, да 400 гектараў абыходзяць, а камяні, як паўжартам скардзіліся тут, усё растуць.

— Вы лепш назавіце людзей нашых, гэта важней, чым паказчыкі. Менавіта людзі і ствараюць гэтыя самыя паказчыкі, — гаварыла падчас нашай сустрэчы дырэктар камбіната...

Безумоўна, гэта так. Як безумоўна і тое, што ёсць тут каго назваць. Майстрам на ўсе рукі называюць на камбінаце механіка Генадзя Бараноўскага (і сапраўды — праз яго рукі прайшло амаль усё абсталяванне), у добрым стане падтрымлівае сваю не менш клапатлівую гаспадарку энергетык Барыс Акулевіч. Дарэчы, у першую чаргу дзякуючы менавіта гэтым спецыялістам на камбінаце шмат чаго зрабілі, калі рыхтаваліся да той жа расійскай атэстацыі. Добра ведаюць тут абвальшчыка Анатоля Шыдлоўскага (ён жа — пазаштатны інструктар прадпрыемства па фізкультуры і спорту), майстра Людмілу Норка і многіх іншых. На камбінаце нямала працоўных дынастый, людзі трымаюцца за сваё прадпрыемства. І не проста з-за таго, што ў Ашмянах не так лёгка знайсці іншую работу. Як гаварыла фінансіст прадпрыемства Настасся Літвіновіч, камбінат для многіх стаў, па сутнасці, другім домам.

10

КАМЕНТАРЫЙ, ЯКІ ІСТОТНА ДАПАЎНЯЕ ВЫШЭЙСКАЗАНАЕ

Юрый АДАМЧЫК, старшыня Ашмянскага райвыканкама: — Мясакамбінат па-ранейшаму застаецца адным з асноўных падатковых плацельшчыкаў раёна. Ён — адзін з самых буйных работадаўцаў. Ён — адзін з самых буйных спонсараў. Ён — адзін з самых буйных інвестараў. Ён — адзін з самых буйных... Можна доўга пералічваць, што ён з'яўляецца для раёна, але ўсё гэта будзе толькі пацвярджэннем таго, што ён — адзін з самых буйных. Ён — адзін з самых буйных, але ён — самы буйны. Самы буйны ў раёне, самы буйны ў вобласці, самы буйны ў краіне. Самы буйны, самы вядомы, самы паважаны. Самы-самы-самы... Ён — самы-самы-самы. І ён — самы-самы-самы не толькі таму, што ён самы буйны, самы вядомы, самы паважаны, але таму, што ён самы-самы-самы. Ён — самы-самы-самы, таму што ён — самы-самы-самы. І ён — самы-самы-самы, таму што ён — самы-самы-самы. І ён — самы-самы-самы, таму што ён — самы-самы-самы. І

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

7

ВЕРАСНЯ
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 37 (15488)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

У ПЕДУНІВЕРСІТЭТА — ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Кожны год 8 верасня Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Танка святкуе Дзень універсітэта.

Старт святкаванню Дня ўніверсітэта дасць інтэрактыўная ролевая гульня для студэнтаў першага курса «Шляхам вагантаў», якая з'яўляецца аналагавай версіяй вядомай гульні «Схватка» і дапамагае першакурснікам з усіх факультэтаў даволі арыгінальным і нестандартным чынам пазнаёміцца з гісторыяй, традыцыямі і «геаграфіяй» сваёй навучальнай установы.

Вечарам 7 верасня запланавана шоў-праграма «Vivat, Alma Mater!», удзел у якой возьмуць вядучыя студэнцкія калектывы і зоркі беларускай эстрады Іна Афанасьева, Ганна Шаркунова, Арт-група «Беларусы», «Dream Ecstasy», «Street Masters» і іншыя. У рамках святочнай праграмы пройдзе таксама ўзнагароджанне лепшых студэнтаў універсітэта па выніках папярэдняга навучальнага года, дэфіле-паказ калекцый адзення маладых дызайнераў БДПУ, і, зразумела, дыскатэка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У новы навучальны год крокам марш!
(Мінскі ліцэй № 2)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАБ НЕ ЗАБЫВАЛІ РОДНУЮ МОВУ

На сённяшні дзень за межамі краіны пражывае каля 2,5 млн этнічных беларусаў. Цяпер Міністэрствам унутраных спраў распрацоўваецца законапраект аб суайчыннікаў за мяжой. Вырашэнне якіх праблем чакаюць ад гэтага дакумента «замежныя беларусы», і ўвогуле, чым жывуць гэтыя людзі? Разабрацца ў гэтым мне дапамаглі ў Беларускім таварыстве па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма».

Колькасць нашых суайчыннікаў, якія жывуць не ў Беларусі — гэта прыкладна чвэрць насельніцтва ўсёй рэспублікі. Калі б яны вярнуліся на радзіму, то значна паправілі б дэмаграфічную сітуацыю. Дзякуючы новаму закону беларусам, якія пажадаюць вярнуцца на Бацькаўшчыну, прадугледжваецца разавая фінансавая дапамога, а таксама льготны крэдыт на кватэру.

— На сённяшні дзень у краіну вяртаецца каля 600 беларусаў у год, — расказвае старшыня праўлення таварыства «Радзіма» Максім Дубянок. — Канешне, прыняцце такога закона прыцягне беларусаў з-за мяжы, але, здаецца, больш тых, хто пражывае на тэрыторыі СНД. З развітых краін свету нашым суайчыннікам пакуль не выгадна вяртацца па эканамічных і сацыяльных прычынах.

Але надзея паправіць дэмаграфічную сітуацыю застаецца, бо ў былых рэспубліках Савецкага Саюза пражывае большая частка беларускай дыяспары.

А пакуль што нашы суайчыннікі, нягледзячы на тое, што жывуць за мяжой, не забываюць свой родны кут. Яны аб'ядноўваюцца ў грамадскія арганізацыі і пастаянна падтрымліваюць сувязь з Беларуссю.

— Раней мне было незразумела, для чаго гэтыя людзі згуртоўваюцца,— гаворыць Максім Уладзіміравіч. — Але калі я сустрэўся з імі, то мне стала ясна, што для іх Беларусь — гэта ЎСЁ. Многія нашы суайчыннікі за мяжой паміж сабой размаўляюць толькі па-беларуску, а таксама вучаць мове сваіх дзяцей. Яны беларускую літаратуру ведаюць так, як не кожны беларус, які жыве ў роднай старонцы... У гэтых людзей вельмі вострае пачуццё настальгіі па Радзіме. Для іх вялікае шчасце і радасць пабываць у мясцінах, дзе нарадзіліся, сустрэцца са сваімі аднакласнікамі, ды проста падыхаць беларускім паветрам! Яны гавораць, што так, як у Беларусі, не дыхаецца нідзе...

Сёння аб'яднанні этнічных беларусаў існуюць у розных гарадах Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Украіны, Малдовы, Казахстана, Кыргызстана, Польшчы, Чэхіі, Бельгіі, ЗША, Канады, Аргенціны, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі і іншых. А нядаўна ў «Радзіму» прыйшоў прадстаўнік беларусаў на Мадагаскары і сказаў, што і яны таксама хочуць стварыць сваю арганізацыю, каб іх дзеці не забывалі родную мову, свае карані...

З якімі праблемамі сустракаюцца сучасныя беларускія аб'яднанні за мяжой?

Праблема нумар адзін — недахоп інфармацыі аб Беларусі. Канал ТВ-Беларусь не заўсёды можна прыняць. Пачынаць Інтэрнэт-сайты беларускай прэсы могуць таксама не ўсе замежныя суайчыннікі. А падпісвацца на беларускія выданні, шчыра кажучы, занадта дорага. Асабліва завоблачны кошт на беларускія газеты ва Украіне, у Польшчы, Эстоніі.

— Сёння нам даводзіцца выпісваць прэсу на свой адрас, а потым пасылаць у розныя гарады нашым суайчыннікам, — расказвае Максім Дубянок. — З-за гэтага адбываюцца вельмі кур'ёзныя выпадкі з гасцямі нашай краіны. Не так даўно ў Беларусь прыехалі дзве дэлегацыі Даўгапілскага ўніверсітэта. Пахадзіўшы па Мінску, яны звярнуліся з пытаннем да гіда: «А дзе вашы танкі і міліцыя з аўтаматамі?» Смешна? А вось гэтым людзям было не да смеху: яны яшчэ тыдзень шукалі пацвярджэнне інфармацыі, якую атрымалі ў прэсе Латвіі аб нашай краіне.

— Гэта не адзіны выпадак, які здараецца як з нашымі суайчыннікамі, так і з замежнымі грамадзянамі. Ім дзіўна бачыць нашу краіну не такой, якой яны яе ўяўлялі, — каментуе здарэнне Максім Дубянок. — Канешне, у Беларусі ёсць праблемы, але не больш чым у іншых краінах, нават менш. Не існуе ідэальнай дзяржавы. Магчыма, дзякуючы «замежным беларусам» шмат людзей у розных краінах ведаюць, што ў Беларусі не дрэнна, што ў ёй жывуць добрыя гасцінныя людзі, у якіх свой менталітэт, свая культура і традыцыі.

Аб гэтым пішуць дыяспарныя СМІ. А што рабіць, калі грошай у арганізацыі недастаткова, каб выдаваць сваю газету? Пакідаць людзей, якія клапоцяцца аб іміджы Беларусі, у інфармацыйнай блакадзе?

Але гэта не адзіная праблема беларускай дыяспары.

Аказваецца, адпачыць на радзіме беларусам, якія атрымалі грамадзянства іншай краіны, не проста. Праз 30 дзён наш «замежны суайчыннік» павінен пакінуць тэрыторыю сваёй Радзімы. У год можна прабыць на Беларусі не больш чым 90 дзён.

У хуткім часе таварыства «Радзіма» плануе прывезці групу «беларускіх амерыканцаў» на трохмесячнае падарожжа па Беларусі. Каб афарміць візы і іншыя дакументы на гэтых людзей, супрацоўнікам «Радзімы» давядзецца хадзіць па інстанцыях не адзін дзень.

— Разумееце, для іх вельмі важна пабываць у родных гарадах, вёсках, падыхаць родным паветрам, — гаворыць Максім Дубянок. — Ды і дзяржаве нашай выгадна прымаць сваіх суайчыннікаў. У сярэднім адзін такі турыст траціць на тэрыторыі Беларусі ад 1,5 да 2 тыс. долараў. Гэта значыць, яны прыносяць даход у казну краіны.

Нашы «замежныя беларусы» не толькі прыязджаюць адпачываць самі, але і запрашаюць гасцей у Беларусь. Так, напрыклад, Асацыяцыя беларусаў Эстоніі арганізоўвае адпачынак эстонцаў у беларускіх санаторыях. На жаль, узровень абслугоўвання ў гасцініцах і санаторыях пакідае жадаць лепшага: кошт не заўсёды адпавядае якасці. З-за гэтага нямала скаргаў.

Нашых суайчыннікаў цікавіць не толькі турыстычны бізнэс. Кіраўнікамі некаторых беларускіх арганізацый за мяжой з'яўляюцца бізнэсмены, якія хацелі б мець эканамічнае супрацоўніцтва з Беларуссю. Але пакуль для гэтага няма юрыдычнай падставы.

— Беларуская дыяспара спадзяецца, што ў гэтым годзе завершыцца распрацоўка закона аб суайчыннікаў за мяжой, — працягвае Максім Дубянок. — Для іх гэта яшчэ адзін крок да Радзімы.

Ёсць у беларускай дыяспары і іншага роду праблемы...

Справа ў тым, што нашы суайчыннікі ствараюць за мяжой беларускамоўныя школы. Там іх дзеці вывучаюць родную мову, культуру, гісторыю. Але ў некаторых школах не хапае кніг, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў на беларускай мове.

— Забяспечыць усім неабходным такія школы нашай арганізацыі дапамагаюць Міністэрства адукацыі і іншыя ведамствы, — гаворыць Максім Дубянок. — Нават нашы мінскія школы перадаюць спісаныя кнігі. Але як і раней, так і зараз беларуская літаратура за мяжой — дэфіцыт.

«Замежныя беларусы» стараюцца не толькі не забыць, адкуль яны родам, але і расказаць людзям іншых краін, што ўяўляе з сябе Беларусь. Для гэтага нашы суайчыннікі праводзяць у розных краінах свету Дні беларускай культуры, іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя культурным і гістарычным датам нашай краіны.

— Зараз у Еўропе існуе рух за захаванне культурнай ідэнтычнасці, — гаворыць Максім Дубянок. — Таму людзі цікавяцца і культурай, і традыцыямі, і кухняй іншых народаў.

Грамадскае аб'яднанне «Радзіма» дапамагае нашым «замежным суайчыннікам» адзначаць беларускія святы за мяжой. Сёння арганізацыя запрашае да супрацоўніцтва пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, беларускія музычныя калектывы, а таксама ўсіх жадаючых.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ВОПЫТ РАБОТЫ І ЗАГАР — АДНЫМ МАХАМ

Выпрабавана на сабе

Усім вядома выказванне «адным стрэлам забіць двух зайцоў». Дык вось, мае новыя знаёмыя Яна Калашнікава і Святлана Галянчук, студэнткі 4 курса Мінскага лінгвістычнага ўніверсітэта, гэтым летам не толькі прайшлі практыку і атрымалі вопыт работы важатых, але і пабывалі на моры, загарэлі, пасталелі і, што немалаважна, знайшлі новых сяброў.

— Кожны студэнт нашага ўніверсітэта пасля 3 курса павінен прайсці практыку, — расказвае Света. — Як правіла, месцам атрымання навыкаў будучай прафесіі з'яўляюцца дзіцячыя летнікі. Нам з Янай пашчасціла працаваць у дзіцячым аздараўленчым летніку «Зара», які знаходзіцца ў Туапсінскім раёне.

Арганізацыяй паездкі беларускіх студэнтаў у «Зару» не першы год займаецца «Ліга добраахвотнай працы моладзі».

Не месца ўпрыгожвае...

Менавіта так лічаць Яна і Света.

— Месца нашага пражывання — пакойчык на чатыры ложка-месцы, — гаворыць Яна. — Нагадваў ён звычайны пакой у звычайным студэнцкім інтэрнаце. Ложкі, тумбачкі, шафы з вешалкамі. Затое былі прыбіральня з душам (беларускія ж інтэрнаты ў асноўным калідорнага тыпу).

— І ў якім стане знаходзілася мэбля? — цікаўлюся.

— Калі зачыняеш тумбачку, яна можа скрыпець. А так сур'ёзных пашкоджанняў не было. Зразумела, што ў пакоях еўрарамонт ніхто не рабіў, ды і пяцізорныя нумары нам не абяцалі, — смяецца Яна. — У «Лізе» на самым першым зборы нас папярэдзілі, каб на джакузі і кандыцыянер мы не разлічвалі (не на курорт жа едзем).

— А ці ўзнікалі праблемы з электразабеспячэннем і гарачай вадой?

— Адзін раз за дзве змены (а Яна працавала тут 42 дні) у летніку праводзіліся рамонтныя работы. У сувязі з гэтым мы з дзецьмі на цэлы дзень хадзілі ў паход. Гулялі, вучыліся ставіць палаткі, раскладваць вогнішча. Калі вярнуліся, усё, як і абяцалі, было ў парадку. А што датычыцца вады, то халодная была пастаянна. Гарачую ж адключалі толькі ноччу і ў час знаходжання дзяцей на моры.

Паводле слоў студэнтак, жыццё ў летніку было настолькі насычаным, што ў сваіх пакоях і важатыя, і дзеці праводзілі лічаныя гадзіны. Таму скрыпучыя тумбачкі і не новыя шпалеры адыходзілі нават не на другі, а на трэці план.

Уражанні не маюць кошту

— Нам абяцалі за змену заплаціць 35 долараў, у выніку ж мы атрымалі 40, — гаворыць Яна. — Усе, безумоўна, вельмі ўзрадаваліся.

— А ці акупіліся вам выдаткі на паездку ў летнік?

— Безумоўна. Нашы грашовыя ўкладанні: уступны ўзнос у арганізацыю (50 тыс. беларускіх рублёў), дарога ў Маскву і назад (120 тыс. беларускіх рублёў) і спецыяльная рабочая форма — жоўтыя майкі з эмблемай летніка, якія засталіся нам на памяць (15 тыс. беларускіх рублёў). Зарабілі мы менш. Але я разглядаю як прыбытак атрыманае духоўнае багацце. Гэта і вопыт работы з дзецьмі, і сябры-важатыя (як з Беларусі, так і з Расіі), і мора, і загар, і новыя месцы, і экскурсіі ў аквапарк, на вадаспады, у дэльфінарый (для важатых яны былі бясплатнымі). Гэта ўсё, на мой погляд, бясцэнна.

Першы блін — але не камяком

— Ніколі раней не даводзілася з'язджаць з дому больш чым на два тыдні, — прызнаецца Яна. — А тут 42 дні. Ды яшчэ і адказнасць вялікая. Дзеці ўсё ж. Баялася, што не спраўлюся, што не змагу знайсці агульную мову са сваімі выхаванцамі. Зараз разумею, што страх быў неабгрунтаваным.

— А з кім цяжэй было знайсці агульную мову — з кіраўніцтвам летніка, з важатымі ці выхаванцамі?

— З дзецьмі, безумоўна. Бо з імі я праводзіла больш часу. А дзяцей шмат, усе розныя, да кожнага трэба падабраць свой ключык, — гаворыць Яна. — Амаль усе былі з Масквы. Калі меркаваць па тэлефонах і фотаапаратах, з забяспечаных сем'яў. Некаторыя — спешчаныя. Таму слабахарактарным важатым тут не месца. Першыя тры дні трэба было і прыкрыкнуць, каб яны не селі на шыю.

— А потым, — дадае Света, — мы так прыкіпелі да дзяцей а яны, у сваю чаргу, да нас, што разумелі адзін аднаго з паўслова.

Дарэчы, і словам, і справай беларускім студэнтам дапамагала старэйшая групы Алена Шарай. Цудоўным псіхолагам і педагогам была кіраўнік дружыны Ірына Кудрашова, якая садзейнічала таму, што дружына стала адным цэлым.

— У летніку ёсць свае традыцыі, і мы павінны былі лічыцца з імі, — гавораць дзяўчаты.

Дзяцей ні на хвілінку нельга было пакідаць без нагляду, бо важатыя неслі за іх юрыдычную адказнасць. У сталоўку атрады хадзілі арганізавана.

— Мы павінны былі сачыць, каб усім хапіла порцый. І толькі пераканаўшыся, што ўсе дзеці накормленыя, садзіліся за стол самі.

Планёрка кожную раніцу пачыналася ў 7 гадзін.

— Спазненне каралася. Напрыклад, калі важаты з Пензы не прыходзіў на планёрку ў час, то з яго заробку вылічвалі 10 рублёў. Да нас жа ставіліся больш лаяльна. «Каралі» ў вуснай форме. Але пасля гэтага нельга ўжо было дазволіць сабе спазняцца.

Наогул, калі адказна падыходзіць да справы, перакананыя студэнткі, то праблем не ўзнікне.

— Вось вы ў сваёй ВНУ вывучаеце замежныя мовы. Ці спатрэбіліся вам веды, атрыманыя за 3 гады навучання?

— Нехта з мацёрых важатых падказаў, — расказвае Яна, — што калі дзеці пачынаюць дурэць і не слухаюцца, трэба сказаць што-небудзь на замежнай мове. Яны адразу ж супакойваюцца і пачынаюць распытваць, што гэта за фраза. А паколькі я вывучаю тры мовы — англійскую, нямецкую і італьянскую, — то ў мяне вялікі выбар для імправізацыі.

Акрамя таго, дзяўчаты расказалі, што дзеці, даведаўшыся, што іх важатыя з Беларусі, прасілі пагаварыць па-беларуску.

— Здзіўляліся, калі чулі, што ў нас хлеб каштуе 700 беларускіх рублёў (шмат нулёў), — усміхаецца Яна.

— Як толькі мы прыехалі ў Мінск, — гаворыць Света, — накіраваліся ў «Лігу добраахвотнай працы моладзі». Хацелі папрасіцца паехаць у «Зару» на чацвёртую змену. На жаль, жадаючых было больш, чым працоўных месцаў. Але мы не сумуем. І з нецярпеннем чакаем наступнага лета.

Надзея ДРЫЛА.

На здароўе!

У Мсціслаўскім раёне прайшла акцыя «За здаровы лад жыцця! Спартыўны інвентар — дзецям!»,

У падарунак школы раёна атрымалі 217 адзінак спартыўнага інвентару — мячы, ракеткі, лыжы, трэнажоры, шахматы і інш. З улікам просьбаў кіраўнікоў школ, у лік падарункаў таксама трапілі тэлевізары, DVD, музычныя цэнтры, капіравальны апарат, мікрафоны, газонакасілка, халадзільнік і наборы інструментаў. Найбольш актыўны ўдзел у акцыі, якая была прысвечана Году дзіцяці, бралі старшыня СВК «Кастрычнік» Пётр Лаўнікаў, дырэктар ААТ «Мсціслаўскі райаграпрамтэхснаб» Аляксей Барсенкоў, дырэктар селекцыйна-гібрыднага цэнтра «Віхра» Сяргей Саханкоў, дырэктар ААТ «Мсціслаўскі масласыраробны завод» Міхаіл Буянаў, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі Уладзімір Влазоўскі, Таццяна Жадавец, Уладзімір Ур'еў.

Ілона ІВАНОВА.

Дзённік Вікі Ц.

Працаваць не хочацца. Гэта першая і найдакладнейшая прымета таго, што адпачынак скончыўся. Дарэчы, прыгадваецца народная мудрасць: ніхто так не мае патрэбы ў водпуску, як той, хто толькі што з яго вярнуўся...

7.09.2007

ЗАХАД ВОДПУСКУ

Першыя дні пасля выхаду на працу нагадваюць заняткі ў школе з традыцыйным сачыненнем «Як я правёў лета». Толькі калі дзяцей прымушалі пісаць міні-аповеды ў абавязковым парадку, то ў дарослых усё наадварот — столькі жадаючых абмяняцца ўражаннямі, дзе яны былі і што бачылі, што хоць ты хавайся ў кут і прыкрыйся венікам!

Але перад гэтым выконваецца асобны рытуал. Спачатку калегі, хто радасна, хто недаверліва, удакладняюць: «Гэта ты ўжо на працы?» Важна ім падыграць і сумна паківаць — ага, маўляў, водпуск быў, ды ўвесь выйшаў... Бо калі, крый Божа, сказаць, што ты яшчэ ў адпачынку, а сюды толькі на хвіліначку — грошы там атрымаць або «хвасты» падцягнуць, як настрой навакольных тут жа мяняецца на раздражнёнае: «Чаго ж вам у адпачынку не сядзіцца?!» Потым у цябе пацікавяцца — дзе быў? Прычым незалежна ад таго, назавеш ты Феадосію ці Барбадосы, Балгарыю або Партугалію, калегі з адноль-кавым ветліва-раўнадушным выглядам працягнуць: «А-а, зразумела». Прытым абсалютна незразумела, што менавіта ім зразумела. Хіба што самыя дасведчаныя ў геаграфіі здзівяцца, што гэта далёка. І хіба што самыя тактоўныя ўстрымаюцца ад фінальнай заўвагі: «А ты і не загарэла зусім...» Як быццам наяўнасцю або адсутнасцю загару (а гэта ўсяго толькі рэакцыя скуры, спроба абараніцца ад празмернай колькасці сонечнага ўльтрафіялету!) вымяраецца ступень рэлаксацыі, разняволення і адпачынку.

Я, напэўна, няправільны адпускнік. Бо не вымяраю адценні загару, не падтрымліваю размоў аб перавагах Харватыі перад Румыніяй або Егіпта перад Турцыяй. Не здзіўляюся, калі чалавек здолеў патраціць на адпачынак усяго 100 долараў ці ажно некалькі тысяч еўра. Не люблю разглядаць чужыя фатаграфіі ў стылі «Я і мясцовы помнік» (падобных здымкаў у кожнага з нас набярэцца цэлы альбом, але ж гэта не нагода для гонару). І гісторыі пра курортныя раманы працягласцю ў пару дзён/тыдняў таксама не люблю. Гэта нейкі сурагат сапраўднага жыцця, дарослая гульня ў дзіцячае сачыненне пра лета. Лета, як спявае філосаф і лірык Алег Міцяеў, — маленькае жыццё, светлае і сонечнае, дзе б ты яго ні правёў, і вяртацца ў вялікае — поўнае надуманых і сапраўдных праблем — зусім не хочацца. Прапаную пераняць вопыт японцаў і даваць выходзячым з адпачынку яшчэ тыдзень на раскачку і паступовае ўваходжанне ў патрэбны працоўны рытм. А то ўсе вакол мітусяцца, прыспешваюць — allegro! (з італьянскай — «хутка», што абазначае тэмп у музыцы), а ты плывеш і ўсміхаешся сваім думкам — lento, lento («павольна»)...

Насамрэч Міцяеў мае рацыю — з водпуску вяртаешся, як з іншай планеты. Некалькі дзён запар ловіш сябе на тым, што падзеі дзеляцца на «а вось у нас» і «а тут у вас». (Да слова: ну і халадэча тут у вас, праўду кажучы. Паветра халаднейшае, чым у нас было мора, прычым ноччу. Таму есці ўвесь час хочацца, і, баюся, выкрышталізаваную падчас адпачынку талію проста не паспею прадэманстраваць — зноў згублю яе месцазнаходжанне). Доўга шукаеш літару «ё» на клавіятуры. Увогуле доўга гуляеш з камп'ютарам у глядзелкі: ты хто? а ты сама — хто? Наноў прывыкаеш да абцасаў, звязкі ключоў у кішэнях курткі — дый да самой курткі таксама. І не перастаеш паўтараць — вось яшчэ б літаральна некалькі дзён адпачыць, а ўжо тады...

Сябар ловіць мяне на гэтых «некалькіх днях» і з палаючымі вачыма працаголіка чытае лекцыю аб тым, што доўгі адпачынак шкодны, пасля яго робішся «рыбай-тормазам», а для перадышкі патрэбны максімум тыдзень, дый тое як мага радзей. Я гляджу на ягоны блакітнавата-белы твар — высакародная офісная бледнасць напрыканцы лета выглядае як грым для акцёрскай масоўкі вампіраў. Параўноўваю са сваім здаровым румянцам на ўсю шчаку і роўным, у меру цёмным загарам (ну і пляваць, што гэта ўсяго толькі рэакцыя скуры на сонечныя промні). Слухаю пра тое, што вось яшчэ адзін праект скончыць, заказчыкам здаць, і ён будзе самым шчаслівым чалавекам. Да наступнага тэрміновага праекта. На гэтым моманце разумею, што я ў больш выйгрышным становішчы, бо самым шчаслівым чалавекам адчувала сябе як мінімум тры тыдні запар. І зараз пастараюся гэта адчуванне захаваць як мага даўжэй — няхай яно змяняецца працоўным імпэтам паступова, як усмешка Чэшырскага ката... Гэтай ціхамірнасцю, адметным настроем адпускніка магу нават падзяліцца, калі каму вельмі спатрэбіцца. А пакуль што з усіх размоў найбольш ахвотна падтрымліваю толькі тыя, у якіх гаворка ідзе пра мора. І пра захад сонца над ім.

Тоўстыя глянцавыя часопісы сцвярджаюць, што за тры тыдні адпачынку чалавек тупее на 30 працэнтаў. Адкуль узялася гэта статыстыка — не ведаю; можа, яна і мае права на існаванне. Але вось па маіх асабістых назіраннях за тыя ж тры тыдні, калі адпачынак сапраўды атрымліваецца добры, чалавек і сам істотна дабрэе. Скажам, на тыя ж 30 працэнтаў. Гайда ў водпуск, за падзарадкай? У мяне яшчэ засталося некалькі дзён...

Як знайсці сабе занятак па душы?

З 8 па 15 верасня ў Беларусі пройдзе Тыдзень установы пазашкольнага выхавання і навучання. Яго ўрачыстае адкрыццё адбудзецца 9 верасня на Савецкай плошчы ў Гродне.

Паводле слоў вядучага інспектара ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Анатоля Андрушкевіча, на сённяшні дзень у Беларусі дзейнічае 351 установа пазашкольнай адукацыі і больш як 29 тыс. гурткоў, дзе займаецца каля 378 тыс. хлопчыкаў і дзяўчынак. За апошнія 3 гады ў краіне было адкрыта больш як 2 тыс. новых гурткоў, а колькасць вучняў, якія наведваюць пазашкольныя ўстановы, павялічылася на 30 тыс. Дарэчы, на платнай аснове дзейнічае толькі 10 працэнтаў ад агульнай колькасці гурткоў, арганізаваных у пазашкольных установах адукацыі. Як правіла, гэта школы ранняга развіцця дзіцяці, камп'ютарныя курсы і заняткі па вывучэнню замежных моў, якія карыстаюцца павышаным попытам.

Тыдзень установ пазашкольнага выхавання і навучання праводзіцца ў Беларусі ўжо трэці год запар. Плануецца, што на працягу сямі дзён ва ўсіх пазашкольных установах пройдуць Дні адчыненых дзвярэй, а педагогі пазашкольнага выхавання наведаюць школы, каб сустрэцца з дзецьмі і прыцягнуць іх у аб'яднанні па інтарэсах.

У Мінску ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання збіраюцца прапанаваць у новым навучальным годзе больш за 100 новых гурткоў. 8 верасня ў парку імя Горкага ў рамках святкавання Дня горада будзе дадзены старт Тыдню пазашкольнага выхавання і навучання. Усе сталічныя пазашкольныя ўстановы прадставяць напрамкі работы сваіх гурткоў, клубаў і секцый. Мяркуецца, што з адкрыццём новых напрамкаў каля 90 тыс. юных мінчан змогуць знайсці для сябе заняткі па інтарэсах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

На свае вочы

АЛЬТЭРНАТЫВА ТРАДЫЦЫЙНАМУ АДПАЧЫНКУ

Міжнародныя валанцёрскія праекты — гэта, як правіла, спалучэнне адпачынку, малакваліфікаванай працы і зносінаў на замежнай мове

Акрамя турыстычных паездак, вакацый на горных і прыморскіх курортах ёсць не зусім звыклая разнавіднасць замежнага падарожжа. Такім варыянтам, у першую чаргу, цікавяцца маладыя людзі, якія не купаюцца ў золаце. За паездку ў іншую краіну і магчымасць вучыць замежную мову яны расплачваюцца фізічнай працай.

Француа вучыцца ў тэхналагічным універсітэце. Ён адразу ж выказаў жаданне працаваць з тэхнікай. Томас, каардынатар нашай працы, улічваў пажаданні ўсіх.

З ЧАГО ЎСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ?

Калі старшыня «Лігі добраахвотнай працы моладзі» Вольга Шмігельская прапанавала мне паехаць валанцёрам у Нямеччыну, я згадзілася не раздумваючы. Хацелася на іншых паглядзець, сябе паказаць і зрабіць усё магчымае, каб летнія вакацыі засталіся ў памяці надоўга.

Перад паездкай трэба было вырашыць шмат бюракратычных момантаў: зрабіць штамп аб дазволе выезду ва ўсе краіны свету, адстаяць чаргу ў пасольстве, каб атрымаць візу (там пазнаёмілася са сваімі калегамі-аднадумцамі), купіць білеты (гэта было таксама праблематычна, бо колькасць месцаў у аўтобусе не заўсёды супадала з попытам на іх). І, нарэшце, «засыпаўшы» пытаннямі накшталт «Колькі грошай трэба з сабой узяць?», «Якое там надвор'е?», «Валанцёры з якіх краін будуць удзельнічаць у праекце?..» каардынатара праграмы «Міжнародныя валанцёрскія праекты» Яраслава Алейніка, я пачала пакаваць чамадан.

І ВОСЬ Я Ў КРАІНЕ СВАЁЙ МАРЫ...

Мая новая сям'я складалася з 15 чалавек. Гэта маладыя людзі з Расіі, Украіны, Сербіі, Карэі, Іспаніі, Францыі, Чэхіі і Германіі. На працягу трох тыдняў мы жылі ў жывапіснай вёсцы, якая знаходзіцца на баварскай зямлі. Гасцінна прыняла нас гаспадыня Дома моладзі (менавіта тут, у трохпавярховым будынку, мы і размясціліся) спадарыня Мюніх.

Паводле слоў бургамістра Хольфельда (горад, ад якога мы жылі на адлегласці 6 кіламетраў) спадарыні Барбіш, гэты міжнародны валанцёрскі праект накіраваны, у першую чаргу, на знаёмства прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў паміж сабой, з культурай іншых краін, прадухіленне варожасці ў адносінах да іншых нацый.

ПРАЦА БЕЗ ЗАРОБКУ

Калі я ад'язджала, некаторыя знаёмыя выказвалі непаразуменне: «Усе едуць за мяжу зарабляць грошы, а ты — працаваць задарма. Навошта табе гэта патрэбна? Будуць там немцы эксплуатаваць...»

Нічога падобнага. Працавалі мы пяць гадзін у суткі, акрамя суботы і нядзелі. У святочныя дні і ў дождж таксама адпачывалі. Праца была нескладаная: фарбавалі лаўкі, абнаўлялі дзіцячыя пляцоўкі, ачышчалі рэчку побач з домам, рабілі касметычны рамонт у дзіцячым садку. Усё гэта было ў радасць. Вольны час планавалі самастойна, улічвалі меркаванні і пажаданні кожнага. У нашым распараджэнні былі спартыўныя веласіпеды, тэнісны стол, басейн.

Кожны дзень прызначаліся два дзяжурныя, якія сачылі за парадкам і стараліся парадаваць астатніх тры разы на дзень стравамі сваёй нацыянальнай кухні.

Прадстаўнікамі мясцовай улады былі арганізаваны экскурсіі па мясцовых адметных мясцінах. Акрамя гэтага, мы наведалі сталіцу Баварыі Мюнхен і стары горад Нюрнберг. Была магчымасць не толькі папрысутнічаць, але і паўдзельнічаць у каталіцкіх і пратэстанцкіх святах. Акрамя гэтага, усе жадаючыя маглі наведаць арганныя канцэрты, пазнаёміцца з творчасцю нямецкіх кампазітараў.

Захапілі добразычлівасць і гасціннасць жыхароў вёскі, нашых чаховых суседзяў. Мясцовы фермер спадар Хуга праводзіў урокі верхавой язды, жанчыны прыносілі пуховыя коўдры, каб мы не змерзлі (сем дзён мы начавалі ў палатцы на пляцоўцы, якая знаходзілася каля дома), на дзень нараджэння дзяўчынкі з Францыі спяклі два вялізныя тарты, на развітанне запрасілі нас на шыкоўны баварскі абед.

Тры тыдні працы валанцёрам у Нямеччыне нельга ацаніць грашыма. Знаёмства з краінай, моўная практыка, навыкі зносінаў з людзьмі розных нацыянальнасцяў — гэта значна большы скарб, чым матэрыяльныя каштоўнасці. І ніхто не зможа пераканаць мяне ў адваротным.

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.



Валанцёр з Карэі Кім (яму адразу было вельмі складана прызвычаіцца да ладу жыцця еўрапейцаў, мы нават рыс спецыяльна для яго гатавалі) і самы юны член нашай міжнароднай сям'і чэшка Люсі на экскурсіі ў пячоры.

А пакуль 13 валанцёраў працуюць, дзве сяброўкі-францужанкі гатуюць абед. Мы з чэшкамі навучылі іх пячы дранікі і вымаўляць назву нацыянальнай стравы («р» — любімы гук французаў, таму дзяўчаты былі на вышыні).

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 ВЕРАСНЯ

6.05 Серыял «Жаночая логіка-4».
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30 Навіны.
7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.25, 8.25 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
9.05 Славянскі базар у Віцебску-2007. «Выбранае».
10.00 Панарама тыдня.
11.00, 17.45 Серыял «Каханне як каханне».
12.15 Маст. фільм «Чартэр».
13.50 Здароўе.
14.25 Nota Bene.
15.15, 19.25 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 «Зорная манаполія, або Як нараджаецца мюзікл».
16.40 Серыял «Права на шчасце». 1-я серыя.
19.35 Гадзіна спорту.
20.00 Серыял «Малады Ваўкадаў». 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.40 Баявік «Арэна смерці».

Спрабуючы спыніць вытворчасць смяротнага зелля, афіцэр марской пяхоты і японскі дэтэктыў становяцца ўдзельнікамі падпольных баёў без правілаў.
23.50 Усе стыхіі.
0.20 Футбол. Часопіс Лігі чэмпіёнаў.

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
Тэхнічная прафілактыка з 9.05 да 15.00.
16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 3.20 Навіны спорту.
16.15 «Прыватны заказ». Серыял.
17.15, 5.05 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Браты па-рознаму».
18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
20.00 Час.
20.50 Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Славенія — Беларусь.
23.20 Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Англія — Расія.
1.05 Трылер «Крайнія меры».

Малады ўрач даведваецца аб нелегальных медыцынскіх доследах на людзях. Спроба высветліць праўду каштуе яму работы, рэпутацыі і нясе пагрозу жыццю.
3.25 Баявік «Няма куды бегчы».
5.45 «Жарт за жартам».

Супрацоўнік страхавой кампаніі выходзіць на пенсію і адразу ж пачынае адчуваць сваю непатрэбнасць.
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.
5.05 «Няхай гавораць».
5.45 «Жарт за жартам».

7.00 Ранішняя падзарадка.
8.00, 17.30 Серыял «Белінда».
8.50 Дак. фільм «На дапамогу! У нас суседзі — бабуіны».
9.45 Добрыя навіны.
10.10 У гэты дзень.
10.15 Меладрама «Добрая жанчына».
11.55, 18.30 Серыял «Расплата за грахі».
12.45 «Тэлебарометр».
13.05, 20.50 Серыял «Махляры».
14.05 Школа рамонту.
14.55 Усё пра бяспеку.
15.25 Дак. серыял «Еўрапейскае ўзбярэжжа з вышыні птушынага палёту».
15.55 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маўс!».
16.25 Серыял «Школа першых ракетак».
16.50 Ядзім дома.
19.30 Беларуская часінка.
20.30 Калыханка.
21.50 Хакей. Формула гульні.
22.20 Баскетбол. Жаночая НБА. Фінал.
23.25 Драма «Прыгажосць д'ябла».

6.05, 17.20 «Міншчына».
6.15 «З чаго пачынаецца раніца».
7.30 «Тыдзень з Аленай Хаданонак».
8.45 «Вялікае снеданне».
9.20 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
